Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

31 ЛІПЕНЯ 2015 г. ПЯТНІЦА № 144 (28002) Кошт 2300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

■ Даслоўна

ЗАМЕСТ ФАКУЛЬТАТЫВА — ПАЎНАВАРТАСНЫ ПРАДМЕТ

Учора ў рэдакцыі «Звязды» адбылася «прамая лінія». На сувязі быў міністр па надзвычайных сітуацыях Беларусі Уладзімір ВАШЧАНКА. Нашы чытачы закранулі шмат тэм — ад лёсу правадніка радыё ў кантэксце грамадзянскай абароны да змен у падыходзе выкладання асноў бяспекі жыццядзейнасці ў школе.

— Зараз АБЖ існуе ў навучальнай праграме як факультатыў. І псіхалогія вучня такая, што факультатыўны прадмет будзе адсунуты на другі план як неабавязковы, — лічыць Уладзімір Вашчанка. — Большую ўвагу ён будзе надаваць тым прадметам, па якіх адзнакі ставяць і якія спатрэбяцца пры паступленні пасля школы ў тую ці іншую навучальную ўстанову. Але нават не ўсе дарослыя ведаюць, як можна абясточыць кватэру, як адшукаць у ёй пры пажары бяспечнае месца, як дзейнічаць пры ўзгаранні. Пытанні простыя, а адсутнасць канкрэтнага адказу на іх рызыкуе стаць фатальнай. Што ўжо казаць пра дзяцей, якія не маюць за плячыма жыццёвага вопыту. Менавіта таму мы і настойваем, каб у школы вярнуўся паўнавартасны, а не факультатыўны прадмет «Асновы бяспекі жыццядзейнасці».

Поўны тэкст «прамой лініі» чытайце ў адным з найбліжэйшых выпускаў рубрыкі «Жывіце ў бяспецы» на старонках газеты і на нашым сайце zviazda.by.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
schklennik@zviazda.by

ЦЫТАТА ДНЯ

Валянцін ЧЭКАНАЎ, міністр гандлю:

«У Мінгандлю няма ніякіх прычын павышаць цэны на тавары, мы павінны па-ранейшаму праводзіць палітыку з памяншэннем цэн і гандлёвых надбавак, а таксама рашэннем праблем сацыяльнага характару. Доля айчынных тавараў на ўнутраным рынку цяпер пераважае. Прырост па гэтым паказчыку склаў 0,5% у параўнанні з аналагічным перыядам 2014-га. Па харчовых таварах унутраны рынак больш як на 80% забяспечваецца за кошт беларускай прадукцыі. Гандаль — адна з ключавых галін эканомікі, у гэтай сферы занята амаль 15% працаздольнага насельніцтва краіны».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 31.07.2015 г.

Долар ЗША	15221,00	▲
Еўра	16698,00	▼
Рас. руб.	257,89	▲
Укр. грыўня	711,26	▲

ISSN 1990 - 763X

ВЫШЫНЯ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Прамысловыя альпіністы працуюць на новабудоўлі. Узводзіцца 19-павярховы дом у раёне сталічнай вуліцы Варанянскага.

■ На свае вочы

ВОСЬ ГЭТА ВУЛІЦА, ВОСЬ ГЭТЫ ДОМ

У Магілёве аб'явілі сапраўдны бой тым, чые дамы псуюць агульны пейзаж

Будынкі, як і людзі, калі догляду няма, хутка набываюць непрэзентабельны выгляд. Здавалася б, праблема больш актуальная для вёсак. Але і Магілёў, дзе яшчэ хапае прыватнага сектара, не выключэнне. Праца з уладальнікамі безгаспадарнай нерухомасці вядзецца, але, як вельмі трапна адзначыў на адной з апошніх планёрак старшыня Магілёўскага гарвыканкама Уладзімір Цумараў, няма яснай карціны і сістэмы ў гэтай працы. На яго думку, пашпартызацыя вуліц з указаннем колькасці дамоў і іх стану дасць магчымасць больш дасканала весці барацьбу з недагледжанай маёмасцю.

ЖЫЛЛЁ ПАВЫШАНАЙ НЕБЯСПЕКІ

Толькі ў Кастрычніцкім раёне Магілёва 330 вуліц і завулкаў, дзе знаходзіцца каля 10 тысяч дамоў прыватнага сектара. На думку раённых улад, агульны стан іх задавальняючы, вось толькі 72 дамы псуюць агульны выгляд.

— Раней такога паняцця, як пашпарт раёна ці вуліцы, не існавала, — кажа **першы намеснік кіраўніка адміністрацыі Кастрычніцкага раёна Магілёва Павел МАРЫНЕНКА.** — Але быў пералік з адрасамі такіх домаўладанняў, а ў ім кантактныя даныя ўласнікаў, адзнакі наведвання іх кантралёрамі. Да яго прыкладаліся фота і апытанні суседзяў. Цяпер гэты віртуальны дакумент для ўнутранай працы збіраемся пашырыць яшчэ некалькімі блокамі. Напрыклад, будзем уносіць звесткі па кожным з дамоў па заключэнні дагавораў са спецпрадпрыемствам на вываз смецця. Бывае, што людзі скардзяцца на тое, што непрыбрана, а самі той дамовы не маюць.

СТАР. 5

■ Надвор'е

ВЯРТАННЕ ЦЯПЛА

У нядзелю прыгрэе ўжо да плюс 29 градусаў

Сёння ўмовы надвор'я на тэрыторыі Беларусі ў асноўным будзе вызначаць вільготная няўстойлівая паветраная маса, якая паступае з Балтыйскага мора, паведамляюць спецыялісты Белгідраметцэнтра.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Таму ўдзень па паўночна-заходняй палове краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Вецер паўднёва-заходні ўмераны, удзень па поўначы парывісты. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе плюс 18-24 градусы. Атмасферны ціск будзе слаба расці.

У першы дзень жніўня тэрыторыя краіны будзе знаходзіцца на паўночнай перыферыі свежага антыцыклону з цэнтрам над паўднёвым усходам Польшчы.

Захаваецца халаднаватае надвор'е. У паўночных раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Мінімальная тэмпература паветра ўначы складзе плюс 6-13 градусаў, а максімальная ўдзень будзе ў межах ад 16 да 23 цяпла. На поўдні краіны паветра прагрэецца да плюс 25 градусаў.

Айчынныя сіноптыкі прагназуюць, што і ў нядзелю ў нас захаваецца ўплыў антыцыклону, цэнтр якога перамесціцца на поўнач Украіны. Чакаецца сухое надвор'е. Мінімальная тэмпература паветра ўначы будзе ўсяго 6-11 цяпла, месцамі — да плюс 13 градусаў, а ўдзень пацяплее да 20-27 цяпла, па паўднёвым захадзе месцамі нават да плюс 29 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.
kurkach@zviazda.by

ЧЫМ ЗЯМЛЯ НАША БАГАТАЯ?

Прэзідэнт патрабуе больш актыўнай работы па разведцы карысных выкапняў

Пра гэта ішла гаворка падчас дакладу кіраўніку дзяржавы міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэя Каўхуты.

Прэзідэнт звярнуў асаблівую ўвагу на сур'ёзныя недапрацоўкі ў разведцы нетраў. «Я проста не веру, што ў нас няма вялікіх аб'ёмаў нафты і што ў нашых нетрах адсутнічае прыродны газ, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — На падобных тэрыторыях у Расіі і іншых краінах здабываецца нямала нафты і прыроднага газу, а таксама каштоўных металаў — тое, што стварае аснову дабрабыту і ўстойлівасці любой эканомікі любой дзяржавы».

Аляксандр Лукашэнка сказаў, што гэтая сустрэча папярэднічае нарадзе, якая сёлета пройдзе на ўзроўні Прэзідэнта і будзе прысвечана тэме запасаў карысных выкапняў у Беларусі, выяўленых і разведаных запасаў, а таксама перспектывам гэтай дзейнасці.

«Далажыце пра тое, што мы маем, і пра тое, што будзем мець заўтра і паслязаўтра. План дзеянняў па сур'ёзным вывучэнні нашых нетраў вы павінны пакласці мне на стол», — запатрабаваў Прэзідэнт. Ён сказаў, што гэтыя пытанні будуць знаходзіцца пад яго асаблівым кантролем.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка лічыць важным улічваць вопыт замежных краін і больш актыўна наладжваць супрацоўніцтва з імі па разведцы карысных выкапняў, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. «Ёсць шмат дзяржаў, якія валодаюць велізарнымі багаццямі сваіх нетраў і кіраўнікі якіх прапануюць нам супрацоўнічаць — Венесуэла, Зімбабвэ і іншыя лацінаамерыканскія і афрыканскія краіны, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Трэба вельмі сур'ёзна разам з зацікаўленымі прапрацаваць гэтыя пытанні, у тым ліку паглядзець, на якіх умовах супрацоўнічаць і што мы ад гэтага будзем мець».

Аляксандр Лукашэнка таксама падкрэсліў: «Гэта не прахадныя мерапрыемствы, гэта — найважнейшыя пытанні; калі хочаце, гэта пытанні будучага дабрабыту нашых людзей, недалёкай будучыні і далёкай будучыні нашых дзяцей», — сказаў Прэзідэнт.

Падчас сустрэчы міністр праінфармаваў аб стане мінеральна-сыравіннай базы ў краіне. У Мінпрыроды маецца кадастр карысных выкапняў, дзе пералічаны ўсе адкрытыя радовішчы, нават адзінкавыя праявы высакародных металаў і каштоўных мінералаў, напрыклад, алмазаў.

ДАРОГАЙ РАЗВІЦЦЯ

Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам міністра транспарту і камунікацый Анатоля Сівака

Прэзідэнт пацікавіўся, як выконваюцца раней дадзеныя даручэнні, у тым ліку па будаўніцтве другой кальцавой аўтадарогі, другой узлётна-пасадачнай паласы ў нацыянальным аэрапорце, вынасе авіярамонтнага завода, а таксама эфектыўнасцю работы чыгуначнай галіны. Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы запатрабаваў далажыць, як рэалізуецца праект платных дарог. Пры гэтым ён звярнуў увагу на тое, што галоўным з'яўляецца прымяненне новых тэхналогій па будаўніцтве і абслугоўванні дарог.

Анатоль Сівак далажыў, што першы этап будаўніцтва другой кальцавой аўтадарогі будзе завершаны ў гэтым годзе, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ўсе ўчасткі аўтадарогі трэба бачыць у такім ракурсе, каб у далейшым яны не стварылі праблем. Прэзідэнту даложана, што будаўніцтва другой кальцавой аўтадарогі вядзецца ў нарматыўныя тэрміны, пры гэтым асноўны ўпор робіцца на эканомію сродкаў без шкоды якасці.

Што тычыцца праекта платных дарог, то, па словах міністра, для таго каб акупіўся першы этап, неабходна яшчэ 8 месяцаў. Ён адзначыў, што міністэрства прытрымліваецца такой пазіцыі, што пасля рэканструкцыі буйной аўтадарогі праз пэўны прамежак часу яна становіцца платнай. У прыватнасці, у хуткім часе плануецца зрабіць платным участак аўтадарогі Жлобін—Гомель.

Прэзідэнт даручаў у лютым заканадаўча ўнесці змены ў дакументы, каб зняць шэраг праблемных пытанняў. Як адзначыў Анатоль Сівак, уносяцца змены ў інвестыцыйны дагавор, дзе прад'яўляюцца пэўныя патрабаванні да аператара сістэмы платных дарог з тым, каб грамадзяне мелі больш аператыўную і аб'ектыўную інфармацыю аб платных дарогах, маглі карыстацца паслугамі ўласнай электроннай скрыні на сайце.

На сустрэчы абмяркоўвалася і пытанне будаўніцтва другой узлётна-пасадачнай паласы ў Нацыянальным аэрапорце Мінск. У цяперашні час ідуць работы па яе праектаванні. Кіраўніку дзяржавы даложана аб тым, як ідзе праца па вынасе авіярамонтнага завода на пляцоўку нацыянальнага аэрапорта. Размова ішла таксама аб рабоце чыгуначнай галіны. Па словах міністра, чыгуначныя перавозкі некалькі прайграюць па эфектыўнасці аўтамабільнаму транспарту.

■ Выбары-2015

СПАЧАТКУ ЎЧАСТКІ — ПОТЫМ КАМІСІІ

Інфармацыйны рэсурс «Выбары-2015» (vybory2015.by) нагадвае, што найбліжэйшай падзеяй у календары галоўнай палітычнай кампаніі краіны з'яўляецца ўтварэнне участкаў для галасавання — не пазней за 9 жніўня.

Утвараць участкі павінны раённыя, гарадскія (гарадоў абласнога падпарадкавання) выканаўчыя камітэты, мясцовыя адміністрацыі па ўзгадненні з адпаведнымі тэрытарыяльнымі камісіямі, кіраўнікамі дыпламатычных прадстаўніцтваў (консульскіх устаноў) Беларусі.

Пасля публікацыі рашэнняў аб утварэнні ўчасткаў для галасавання з указаннем межаў кожнага (на публікацыю даецца яшчэ 10 дзён) пачнецца вылучэнне прадстаўнікоў у склад участковых выбарчых камісій, якое павінна завяршыцца да 23 жніўня.

Такім чынам, участковыя камісіі будуць створаны да 26 жніўня, або не пазней чым за 45 дзён да выбараў.

Цэнтральная выбарчая камісія таксама нагадвае, што прынцыпамі дзейнасці ўчастковых камісій з'яўляюцца незалежнасць, галоснасць, абавязковасць выканання рашэнняў вышэйшых камісій і калегіяльнасць. Менавіта ўчастковыя камісіі арганізуюць галасаванне ў дзень выбараў, праводзяць падлік галасоў і фіксуюць вынікі галасавання па ўчастку. Назіральнікам на ўчастку для галасавання могуць быць беларускія парламентарыі і дэпутаты мясцовых Саветаў, даверaныя асобы кандыдатаў у Прэзідэнты, прадстаўнікі палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў, замежных дзяржаў і міжнародных арганізацый.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА

■

МОЦНАЯ ПАЗІЦЫЯ

Міжнароднае рэйтынгавае агенцтва Standard & Poor's пацвердзіла доўга- і кароткатэрміновыя крэдытныя рэйтынгі контрагента па абавязацельствах у замежнай і нацыянальнай валюце Беларусбанка на ўзроўні «B-/C» са стабільным прагнозам.

У прэс-службе банка паведамілі, што яго бізнес-пазіцыю Standard & Poor's ацанілі як «моцную». Устойлівыя пазіцыі ў сегменце карпаратыўных і рознічных банкаўскіх паслуг дазваляюць банку захоўваць значную і стабільную базу дэпазітаў у нацыянальнай валюце. Што тычыцца паказчыкаў фандавання (прыцягнутыя рэсурсы, якія выкарыстоўваюцца банкам для забеспячэння сваёй асноўнай дзейнасці), то іх ацанілі на ўзроўні «вышэй за сярэдні», а паказчыкі ліквіднасці — як «адэкватныя».

Ілья КРЫЖЭВІЧ.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

ТРАСА ДА ГОРАДА ЭНЕРГЕТЫКАЎ

Будучая Беларуская АЭС атрымала новыя пад'язныя шляхі, і разам з тым палепшылася транзітная прывабнасць рэгіёна.

Адкрыты рух па новай трасе Р-52, якая звязвае Ашмяны, Астравец, Беларускую АЭС і дзве аўтадарогі — Мінск—Вільнюс і Вільнюс—Полацк. Яе пабудавалі, выкарыстаўшы больш за 3 мільёны кубаметраў грунту і каля 300 тысяч тон асфальтабетону, работнікі Гродзенскага ДБТ №6 разам з мостабудаўнікамі МБУ №7.

Дзяржаўная камісія прыняла апошні ўчастак трасы (15,6 кіламетра), а ўвогуле яе працягласць складае каля 50 км. На ёй — 3 масты і столькі ж пуцеправодаў, мінімум перасячэнняў і населеных пунктаў у інтарэсах бяспекі руху. Сучасную двухузроўневую развязку пабудавалі на выездзе з Ашмян, дзе новая дарога перасякаецца з трасай Мінск—Вільнюс. Яна асвятляецца ноччу, зроблены тунелі для пешаходных пераходаў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

БУЙНАЙ РОЗНІЦЫ НАМЯКНУЛІ «НЕ ЗАРЫВАЦЦА»

Цяпер гандлёвым сеткам прыйдзецца рэальна пасябраваць з айчыннымі пастаўшчыкамі

Тэрытарыяльныя антыманапольныя органы краіны збіраюцца ўзмацніць кантроль за дзейнасцю гандлёвых сетак, каб выключыць факты нядобрасумленнай канкурэнцыі. Пра гэта паведамляе прэс-служба Міністэрства эканомікі паводле вынікаў «круглага стала» ў дэпартаменце цэнавай палітыкі гэтага ведамства.

Удзельнікі мерапрыемства адзначылі, што спецыфіка становішча, якое займаюць на рынку сеткавыя гандлёвыя аператары, «спрыяе паслабленню эканамічных пазіцый пастаўшчыкоў, рызыкі дзейнасці якіх узрастаюць». У прыватнасці, рыначная перавага мясцовых рытэйлераў «можа прывесці да ўзнікнення высокіх бар'ераў уваходу на таварныя рынкі айчынных вытворцаў харчовых тавараў», паведамляюць спецыялісты міністэрства.

Менавіта таму было прынята рашэнне аб тым, што «тэрытарыяльнымі антыманапольнымі органамі будзе выбарачна праведзены аналіз дагаворнай практыкі мясцовых вытворцаў тавараў пры ажыццяўленні паставак тавараў найбуйнейшым гандлёвым сеткам на прадмет наяўнасці ў іх дыскрымінацыйных умоў, якія перашкаджаюць развіццю здаровай канкурэнцыі».

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

ГАСПАДАРЧЫ ПАДЫХОД

У Уздзенскай цэнтральнай раённай бальніцы працягваецца рамонт гаспадарчым спосабам. Такі метад больш выгадны, чым падрадны, паколькі дае 70% эканоміі, канстатаваў галоўны ўрач установы Аляксандр ДРАЙЧУК.

Бальніца ўведзена ў дзеянне ў 1986 годзе. За гэты час яна ні разу не рамантавалася. Лячэбныя карпусы, падсобныя памяшканні, тэрыторыя прыйшлі ў занядбаны стан: разбураныя сцены, разбіты асфальт. Цяпер сітуацыя карэнным чынам змянілася. Добраўпарадкаваны ўнутраны двор, адрамантаваны пральня і на 50% — блок харчавання, ідзе замена сістэмы каналізацыі, водазабеспячэння, абнаўляюцца кабінеты. Мяняюцца да лепшага і лячэбныя ўстановы на вёсцы: з 18 фельчарска-акушэрскіх пунктаў у 10 зроблены еўрарамонт.

— Сродкі на рамонт выдаткаваў Мінаблвыканкам, — адзначыў Аляксандр Драйчук. — Летась асвоілі крыху больш 6 млрд рублёў, сёлета — 3 млрд 600 рублёў. Да справы падышлі адказна: самі планавалі чарговасць работ, выбіралі будаўнічыя матэрыялы, фарбу, наймалі людзей. У выніку рамонт абышоўся ў 2-3 разы танней.

Закончыць усе работы мяркуецца на працягу двух гадоў.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

ФАЗАНЫ Ў КАПЫЛІ? ЧАМУ Б І НЕ!

У паляўнічай гаспадарцы Капыльскага лясгаса ў недалёкай перспектыве можна будзе паляваць на фазанаў.

— У сярэдзіне жніўня тут уводзіцца ў дзеянне фазанарый на 3 тысячы пагалоўя. На яго будаўніцтва ўжо затрачана больш за 1 млрд рублёў сродкаў лясгаса.

Развядзенне фазанаў у паляўнічых мэтах — па сутнасці, новы напрамак для Беларусі. У краіне пакуль адзінкі суб'ектаў гаспадарання займаюцца гэтай справай, у асноўным — прыватныя фірмы. Сярод дзяржаўных арганізацый Капыльскі лясгас, бадай, першапраходзец. Тут плануюць закупіць матачнае пагалоўе для вывядзення маладняку, а калі атрымаецца, то і яйкі. Затым падбяруць участак, магчыма, забалочаны, з кустоўем, зараснікамі. Падымаць «на крыло» птушак будуць сабакі.

Кожны ахвотны за пэўную плату зможа тут папаляваць і адпачыць у доме паляўнічага з камфортам: два пакоі на двух чалавек кожны, халодная і гарачая вада, камін у гасцінай, кухня, душ, туалет, спадарожнікавае тэлебачанне, тэлефон. На тэрыторыі абсталяваны мангал, альтанка, лазня.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

ГАРЭЛКА ПАД АРЫШТАМ

У Магілёўскай вобласці затрыманы нелегальны груз з алкагольнай прадукцыяй амаль на 286 мільёнаў рублёў.

Супрацоўнікі фінансавай міліцыі і УУС Бабруйскага гарвыканкама выявілі яго падчас праверкі грузавога аўтамабіля «Мерседэс-Бенц», за рулём якога знаходзіўся 30-гадовы жыхар Бабруйскага раёна. Некалькі тысяч бутэлек з гарэлкай, віскі, ромам, каньяком і вінным напоем расійскай вытворчасці былі схаваны за ўпакоўкамі ўцяпляльніка для будаўнічых работ. Там жа правершчыкі знайшлі 250 літраў спіртавой вадкасці ў 5-літровых ПЭТ-бутэльках. Увесь тавар на агульную суму 285,7 мільёна рублёў перамяшчаўся без дакументаў і маркіроўкі, якія б пацвярджалі яго ўвоз на тэрыторыю Беларусі.

— Алкагольныя напоі везліся з Расіі ў Бабруйск з мэтай далейшага нелегальнага перапродажу іх праз «гандлёвыя пункты» ў прыватным сектары,— удакладніў **намеснік начальніка ўпраўлення ДФР КДК па Магілёўскай вобласці Аляксандр ШАРОЙКІН.** — Груз канфіскаваны, а парушальніка чакае прыцягненне да адміністрацыйнай адказнасці. Нагадаю, што грамадзяне, якія займаюцца нелегальным абарачэннем алкагольных вырабаў, рызыкуюць трапіць яшчэ і пад крымінальную адказнасць.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

■ Рабі, як мы!

ПЛІТКА... З ПОЛІЭТЫЛЕНУ

Вельмі перспектыўны метад выкарыстання другаснай сыравіны знайшлі кіраўскія камунальнікі. Яны збіраюцца выпускаць тратуарную плітку, бардзюрны камень і каналізацыйныя люкі з адходаў палімернай плёнкі і рачнога пяску.

— Гэты вопыт мы падглядзелі ў Брэсцкай вобласці, там жа за кошт бюджэтнай пазыкі закупілі лінію, — паведаміў **кіраўнік Кіраўскага жылкамгаса Юрый МАЦЮШОНАК.** — Яе магутнасць да 100 кілаграмаў у гадзіну. Выкарыстаны палімер набываем у нашых гаспадарках. У запасе ёсць 20-30 тон, так што на першы час хопіць.

Пробная партыя плітак ўжо зроблена, засталося прайсці сертыфікацыю і атрымаць неабходныя дакументы для ажыццяўлення дзейнасці на законных падставах. На думку Юрыя Мацюшонка, гэта адбудзецца ўжо да пачатку восені. Справа для камунальнікаў новая, але яны бачаць у ёй вялікую карысць. Гэта дапаможа эфектыўна выкарыстоўваць другасную сыравіну, палепшыць экалогію і нават прадухіліць злачынасць. Пагадзіцеся, што палімерныя люкі наўрад ці зацікавяць «паляўнічых» на металы. А галоўнае, створана 18 новых працоўных месцаў.

З дапамогай вельмі запатрабаваных будматэрыялаў прадпрыемства збіраецца вырашыць спачатку свае праблемы з добраўпарадкаваннем двароў і дарог, а лішкі прадукцыі будзе прадаваць стараннім арганізацыям. Дарэчы, ахвотнікі набыць яе ўжо ёсць, у тым ліку і сярод прыватных асоб.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
zigulya@zviazda.by

■ Добрая навіна

РЭКАРДСМЕН ПА ПЕРШАКЛАШКАХ

Новая школа ў Гродне стане лідарам у вобласці па колькасці вучняў першых класаў

У верасні гасцінна адкрые дзверы новая школа ў густанаселеным (каля 56 тыс. чалавек) мікрараёне Вішнявец. Паводле слоў начальніка ўпраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама Аляксандра СОНГІНА, яна дазволіць разгрузіць перапоўненыя ўстановы адукацыі.

У чатырохпавярховай школе на 33 класа-камплекта ў дзве змены змогуць атрымліваць адукацыю 1,3-1,5 тысячы хлопчыкаў і дзяўчатак. Плануецца арганізаваць прамежкавую дзённую змену для некаторых класаў. Акрамя таго, у школе будзе асобны спартыўна-аздараўленчы комплекс. У пазаўрочны час трэнажорныя залы, футбольнае і баскетбольныя палі, валейбольныя пляцоўкі, хакейная каробка, тэнісны корт, а таксама басейн будуць даступныя не толькі школьнікам, але і жыхарам мікрараёна.

Сярэдняя школа №40 з'яўляецца копіяй папярэдняй новабудоўлі, якая адкрылася 1 верасня мінулага года ў новым мікрараёне Гродна — Альшанка. Тады ў СШ №39 было набрана 13 першых класаў па 25-28 вучняў, што стала своеасаблівым рэкордам для горада па ліку першаклашак. А сёлета рэкардсменам стане новая школа. Тут ужо сфарміравана 16 першых класаў, і набор працягваецца.

Для матуль з Вішняўца, якія знаходзяцца ў дэкрэце, таксама ёсць добрая навіна: побач з новай школай узводзіцца дзіцячы сад. Ён, плануецца, прыме сваіх першых маленькіх выхаванцаў напрыканцы бягучага года, паведамілі ва ўпраўленні адукацыі.

Надзея ПАЎЛАВА.

■ Ведай нашых!

КРЫЖАВАНКА З 41-га

З 9 дыпломаў рэспубліканскага конкурсу сярод школьных музеяў баявой славы 5 атрымала Магілёўская вобласць

Прызавыя месцы занялі музеі Кадзінскай і Раманавіцкай школ Магілёўскага раёна, Дараганаўскай Асіповіцкага раёна, а таксама Магілёўскага агралесатэхнічнага каледжа імя Арлоўскага. А пераможцам стала магілёўская сярэдняя школа №34 г. Магілёва.

— Гэта дзякуючы нашай інфарматызацыі, — упэўнена **завуч гэтай школы і ідэйная натхняльніца музея Галіна БЯЛЯЕВА.** — Усе нашы экспанаты алічбаваныя, і іх можна ўбачыць на школьным сайце. Дарэчы, апошні штодзённа наведвае каля 500-600 карыстальнікаў. Аднойчы нават быў пастаўлены своеасаблівы рэкорд — 9000 наведванняў. Прычым сярод нашых віртуальных гасцей хапае не толькі беларусаў, а яшчэ і расіян, украінцаў, немцаў. Цікавіліся нашымі знаходкамі карыстальнікі з ЗША, Канады, Чэхіі, Вялікабрытаніі і нават з Кітая і Чылі.

Музей насамрэч уражвае. У яго фондах захоўваецца каля 3000 экспанатаў. Але настаўнікі і дзеці не абмяжоўваюцца толькі вайной. Тут хапае каштоўных матэрыялаў па гісторыі Магілёва. Цікавасць да экспанатаў праяўляюць студэнты і нават выкладчыкі МДУ імя Куляшова. А навучэнцы, у тым ліку іншых школ, тут — пастаянныя госці.

Што датычыцца ваеннай тэматыкі, то маецца шмат чаго эксклюзіўнага. Напрыклад, асабістыя рэчы байцоў 290-й стралковай дывізіі. Адзін з былых салдатаў нават перадаў музею рарытэтныя часопісы часоў вайны («Красноармеец», «Огонёк») і пасляваенных («Савецкі воін»).

— Уяўляеце, ёсць асобнікі 1941 года з неразгаданымі да канца крыжаванкамі, — кажа Галіна Беляева. — Мы спецыяльна робім іх ксеракопіі і аддаём дзецям. Там хапае вельмі простых пытанняў без адказаў. Магчыма, баец не паспеў упісаць слова, таму што пачаўся бой.

Нядаўна музей расчыніў свае дзверы пасля рэканструкцыі. За апошнія два гады тут зроблена каласальная праца — адсканаваны і алічбаваны ўсе экспанаты, зроблены сучасны інтэр'ер. Падчас адкрыцця грамадская арганізацыя «Белая Русь» падаравала тэлевізар, які наведвальнікі могуць выкарыстоўваць у якасці манітора, працуючы з музейнымі матэрыяламі.

— Унікальнасць школьных музеяў у тым, што яны існуюць на голым энтузіязме настаўнікаў і іх вучняў, — кажа **загадчыца аддзела краязнаўства і пошукавай працы Магілёўскага абласнога цэнтра творчасці Святлана ХАДОРКІНА.** — Яны працягваюць хадзіць у экспедыцыі і пастаянна папаўняць свае фонды. Тут ідзе сапраўдная патрыятычна-выхаваўчая дзейнасць без усякага фальшу. Вучні нават пасля школы працягваюць адсочваць лёс калісьці знойдзеных імі экспанатаў. А самыя апантаныя паступаюць на гістфак, каб потым прафесійна заняцца музейнай справай і захапіць сваёй неабыякавасцю іншых.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

■ Ёсць праблема

КУДЫ «СХАВАЦЦА» БАТАРЭЙЦЫ?

Сістэме па зборы не хапае кантэйнераў і рэкламы

У канцы мінулага года Саўмін прыняў пастанову №1124, згодна з якой буйныя гандлёвыя аб'екты мусяць прымаць адходы электроннага электрычнага абсталявання (ЭЭА) і ўпакоўку ад насельніцтва. Нагадаем: батарэйкі забярэ любая крама, плошча якой больш за 100 квадратных метраў. Энергазберагальныя лямпы можна здаць у нехарчовай краме плошчай 400 «квадратаў» і больш. У аб'ектах гандлю ад 500 квадратных метраў і больш прымуць буйную электратэхніку. Як насамрэч рэалізуецца пастанова?

КАНТЭЙНЕР — НА 9,5 ТЫСЯЧЫ ЧАЛАВЕК

— Прынятая ўрадам практыка збору адходаў ЭЭА ў гандлёвых арганізацыях даволі распаўсюджаная і лічыцца адносна прагрэсіўнай, — адзначыў **галоўны спецыяліст дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» Сяргей ЮРЧА.** — Аднак збіраць адходы патэнцыйна мусяць 5300 крам, а на справе гэтым займаюцца толькі 1262 аб'екты гандлю. У сярэднім на 9,5 тысячы чалавек прыпадае ўсяго адзін кантэйнер для збору батарэек. Зразумела, што гэтага недастаткова.

Тым не менш, у параўнанні з мінулым годам, аб'ёмы сабранага «смецця» павялічыліся — за першы квартал бытавой тэхнікі сабралі на 50% больш; лямпачак, якія змяшчаюць ртуць, — на 30% больш. Сёлета «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» збіраецца выдатказаць на паляпшэнне сістэмы збору адходаў 6,6 мільярда рублёў. Большая частка сродкаў пойдзе на набыццё і размяшчэнне ў крамах кантэйнераў. Грошы будуць укладзены і ва ўдасканаленне сістэмы перапрацоўкі і транспартавання адходаў электроннага электрычнага абсталявання. Выдзеляць сродкі на вываз сабраных батарэек за мяжу — як вядома, пакуль у Беларусі няма прадпрыемства па іх перапрацоўцы.

НЕЗАЎВАЖАНАЯ «СМЕТНІЦА»

Супрацоўнік Цэнтра эколагічных рашэнняў Анатоль КАЛАЧ заўважыў — сістэме па зборы адходаў ЭЭА не хапае інфармацыйнай падтрымкі. Побач з кантэйнерамі няма стэндаў для аб'яў, якія б тлумачылі, навошта тут знаходзіцца гэтая «скрыня». Часам даходзіць да таго, што самі супрацоўнікі крам не ведаюць пра існаванне кантэйнера. Апошнія бываюць розных канструкцый і колеру, і гэта дэзарыентуе людзей. Калі кантэйнеры знаходзяцца на падлозе, наведвальнікі блытаюць іх са звычайнымі сметніцамі і кідаюць туды чэкі ды іншае смецце.

Супрацоўнік кампаніі «БелВТІ», якая займаецца зборам адходаў ад насельніцтва, Ігар ГАРБАЧОЎ пацвердзіў: актыўнасць людзей моцна залежыць ад інфармавання. Для кампаніі самай

эфектыўнай рэкламай стала размяшчэнне інфармацыі пра паслугі на зваротным баку «жыроўкі».

— У самой пастанове прапісана, што насельніцтва трэба інфармаваць, але гэтае патрабаванне не выконваецца, — канстатаваў Сяргей Юрча. — Кантэйнер у краме часта застаецца незаўважаным.

«Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» будзе актыўна дапамагаць у інфармаванні насельніцтва, тым больш ужо пачаў рэалізоўвацца рэспубліканскі праект «Мэта-99», скіраваны заахвочваць людзей да асобнага збору адходаў.

Кацярына РАДЗЮК.
radziuk@zviazda.by

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

ЗОРКА Ў ГОНАР МЕТАЛУРГАЎ

Адна з зорак у сузор'і Арыён носіць імя Беларускага металургічнага завода

Такі падарунак у знак павагі да поспехаў і працоўных дасягненняў калектыву прадпрыемства зрабіў партнёр з Клайпеды — кампанія Baltic shipping. Сертыфікат, які пацвярджае ўнясенне запісу ў Міжнародны каталог нябесных цел аб прысваенні рубінавай зорцы сёмай велічыні з каардынатамі: a05h00m08.22s ? + 03A ° 17'12.0» у сузор'і Арыён імя «Беларускі металургічны завод», знаходзіцца ў музеі прадпрыемства, — паведаміў прэс-сакратар прадпрыемства Аляксандр АЛЕСІК.

Сузор'е Арыён займае на небе плошчу ў 594,1 квадратнага градуса і змяшчае 209 зорак, бачных няўзброеным вокам. Лепш за ўсё яго відаць па начах са снежня па сакавік. У размяшчэнні яркіх зорак Арыёна лёгка «чытаецца» фігура паляўнічага. Адлегласць ад БМЗ да аднайменнай зоркі прыблізна роўная 650 светлавым гадам.

Надзея ПАЎЛАВА.

АДКРЫЦЬ БІЗНЕС... ВІРТУАЛЬНА

Займець уласную справу стане прасцей

Тым, хто хоча пачаць свой бізнес, дапаможа новы інфармацыйны партал. Пра гэта паведаміў намеснік дырэктара дэпартамента па прадпрымальніцтве Міністэрства эканомікі Пётр АРУШАНЬЯНЦ.

Якім жа чынам будзе працаваць партал? Па запыце карыстальніка сістэма аўтаматычна задасць яму шэраг пытанняў для ўдакладнення, а пасля падбярэ пералік дакументаў, з якімі ахвотнаму варта азнаёміцца, і прапануе нумары тэлефонаў ведамстваў, з якімі трэба звязацца. Так працуе канадская сістэма, досведам якой карыстаюцца айчынныя спецыялісты. Кансультантам пры стварэнні інфармацыйнага партала будзе Міжнародная фінансавая карпарацыя, структурнае падраздзяленне Сусветнага банка.

У перспектыве рэсурс стане не толькі інфармацыйным, але і фінансавым — пры яго дапамозе можна будзе здзяйсняць пэўныя транзакцыі. Таксама партал дапаможа сэканоміць час на бюракратычных працэдурах: запоўніць заяўкі, прымацаваць пэўныя дакументы і даслаць іх у адпаведныя ведамствы можна будзе прама на сайце.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*

НА МІЛІЦЫЯНЕРАЎ — З СЯКЕРАЙ

Нялёгкім выдалася дзяжурства ў супрацоўнікаў ДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама **лейтэнантаў міліцыі Канстанціна Нікіфарава і Дзмітрыя Дзем'янкова.** Каля 10 гадзін вечара яны атрымалі інфармацыю, што на адной з вуліц вёскі Сухары Магілёўскага раёна суседскія разборкі перараслі ў панажоўшчыну. На месцы міліцыянеры заспелі толькі брыгаду медыцынскай дапамогі, якая ратавала мужчыну, што атрымаў цяжкія цялесныя пашкоджанні. Ім падказалі, што зламыснік схаваўся ў сябе дома. На патрабаванні супрацоўнікаў міліцыі выйсці той адмовіўся. А калі яны, выбіўшы дзверы, праніклі ў дом, накінуўся з сякерай. Прыйшлося прымяніць сілу, каб супакоіць раз'юшанага мужчыну.

У дачыненні да зламысніка Магілёўскім міжраённым аддзелам Следчага камітэта распачата крымінальная справа. За наўмыснае прычыненне цяжкага цялеснага пашкоджання суседу і агрэсіўнае супраціўленне праваахоўнікам яму пагражае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін да васьмі гадоў.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

■ Падаткі

ПА ДАЎГАХ ЛЕПШ ЗАПЛАЦІЦЬ

НА СУМНІЎНЫЯ ПАЗЫКІ НАЛІЧЫЛІ КАЛЯ 25 МЛРД. РУБЛЁЎ ПАДАТКАЎ

Сёлета мінчане ўжо пералічылі 3,5 мільярда рублёў у казну ў якасці падаткаў з пазык. Увогуле ў першым паўгоддзі каля паўсотні жыхароў сталіцы пазычалі вялікія сумы грошай, а ў выніку падатковыя інспектары налічылі ім ажно 4,5 мільярда рублёў падаходнага падатку. З іх 3,5 мільярда рублёў ужо ўнесена ў бюджэт.

Адразу нагадаю, што з першых дзён 2015 года беларусам трэба плаціць падаходны падатак з пазык (крэдытаў), якія былі атрыманы ад іншых фізічных асоб, ад замежных арганізацый, што не ажыццяўляюць сваю дзейнасць на тэрыторыі Беларусі праз пастаяннае прадстаўніцтва, а таксама ад замежных індывідуальных прадпрымальнікаў. Такое падаткаабкладанне тычыцца тых грамадзян, якія па патрабаванні падатковых органаў павінны падаць дэкларацыю аб даходах і маёмасці.

Напрыклад, калі чалавек рабіў дарагія пакупкі (набываў нерухомасць, аўтамабіль або долю ў бізнесе), але пры гэтым атрымліваў невялікую заработную плату або зусім не меў даходаў. Калі ў гэтым выпадку ў дэкларацыі аб даходах і маёмасці ён можа паказаць, што рабіў гэтыя пакупкі за кошт пазыкі ў іншай фізічнай асобы, то з гэтай сумы яму трэба будзе выплаціць падаходны падатак. Аплаціць такі падатак па стаўцы 13% трэба ў 30-дзённы тэрмін з дня ўручэння паведамлення ад падатковага органа.

Не абкладаецца падаткам указаная ў дэкларацыі пазыка, калі яна атрымана ад блізкага сваяка: мужа і жонкі, бацькоў, дзяцей, родных братоў і сясцёр, дзядоў, бабак, унукаў, а таксама ад блізкіх сваякоў жонкі ці мужа. Падаходны падатак не бярэцца з сум пазык, атрыманых ад беларускіх арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, а таксама крэдытаў, атрыманых у беларускіх банках і нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых установах.

Нагадаем, што такі «падатак на даўгі» трэба аплачваць абавязкова, але, як толькі чалавек разлічыцца па пазыках, выплачаны падатак яму вернуць. Мера непапулярная, але неабходная. Яна ўжываецца ў дачыненні тых, хто ўхіляецца ад падаткаў, агучыла погляд галіны намеснік міністра па падатках і зборах Святлана Шаўчэнка. Паводле яе слоў, пад пазыкамі нярэдка легалізуюцца ценявыя даходы.

Увогуле па ўсёй краіне за першае паўгоддзе падаткавікі налічылі ажно 25 мільярдаў рублёў падатку на такія сумнеўныя пазыкі. Цяпер амаль 9 мільярдаў рублёў такіх падаткаў «даўжнікі» ўжо пералічылі ў бюджэт. За прыватнымі пазыкамі спрабавалі «схавацца» 604 чалавекі. Напрыклад, жыхар Гродна, які пазычыў больш за мільярд рублёў на набыццё нерухомасці, унёс у бюджэт 144 мільёны рублёў у выглядзе падатку.

Сяргей КУРКАЧ.
kurkach@zviazda.by

■ Перспектыва

«СУХІ ПОРТ» БЕЛАРУСІ

Пасля завяршэння мадэрнізацыі гарадской таварнай станцыі Калядзічы ў Мінску Беларуская чыгунка атрымала ключавы праект у сферы транспартнай лагістыкі і адкрывае новыя перспектывы развіцця экспартна-імпартных грузавых перавозак, у тым ліку па лініі зносін Беларусь — Кітай

Мадэрнізацыя станцыі была пачата ў 2010 годзе і ажыццяўлялася па Праграме развіцця лагістычнай сістэмы Беларусі на перыяд да 2015 года, паведаміў карэспандэнту выдання намеснік генеральнага дырэктара дзяржаўнага прадпрыемства «Белінтэртранс — транспартна-лагістычны цэнтр» (БТЛЦ) Беларускай чыгункі Уладзіслаў ЛЕМБІЕЎСКІ.

За пяць гадоў рэалізацыі праекта была цалкам мадэрнізавана тэрмінальна-складская інфраструктура станцыі Калядзічы. Да рэканструкцыі яе транспартна-лагістычны цэнтр «Мінск» перапрацоўваў да 600 тысяч тон грузаў, летась гэты паказчык павялічыўся да 700 тысяч тон, а цяпер агульная магутнасць павялічылася да мільёна тон грузаў за год. Менавіта пасля мадэрнізацыі былі значна павялічаны магутнасці станцыі Калядзічы па захоўванні і перапрацоўцы грузаў. Калі раней карысная плошча кантэйнернай пляцоўкі №1 складала 17 тысяч квадратных метраў, а перапрацоўчая здольнасць — 40 тысяч кантэйнераў у дваццаціфутавым эквіваленце (ДФЭ) за год, то сёння агульная карысная плошча кантэйнерных пляцовак №1 і №2 дасягнула 30 тысяч «квадратаў», а іх агульная перапрацоўчая здольнасць павялічылася да 100 тысяч кантэйнераў у ДФЭ за год.

«20% з агульнага аб'ёму загрузкі станцыі праходзіць праз яе транзітам, калі тавары тут апрацоўваюцца і адпраўляюцца далей, у трэція краіны».

FERRARI ВЕТРУ НЕ БАІЦЦА

Сяргей ШВЫРОЎ, дырэктар транспартна-лагістычнага цэнтра «Мінск», у склад якога ўваходзіць станцыя «Калядзічы», паведаміў, што ў 2012-2015 гадах тут быў значна абноўлены аўтапарк, а таксама механізмы, якія выкарыстоўваюцца для пагрузкі і выгрузкі, кранавае абсталяванне. Сёння на станцыі працуе нямецкі казлавы кран грузападымальнасцю да 55 тон, вілачныя пагрузчыкі грузападымальнасцю да 5 тон, рычстакеры для кантэйнераў ад італьянскай

Пагрузку кантэйнераў рычстакеры Ferrari ажыццяўляюць у любое надвор'е.

Фота БЕЛТА.

фірмы Ferrari грузападымальнасцю да 45 тон. Маецца ўласны спецаўтатранспарт: сайдліфтары з кантэйнернай платформай (з бакавым грузападымальнікам), якія не маюць аналагаў у Беларусі.

Сяргей Швыроў адзначае, што выкарыстанне сучаснага абсталявання значна пашырае магчымасці станцыі і дазваляе якасна абслугоўваць кліентаў пры розных кліматычных умовах. Так, раней старыя краны маглі працаваць з грузам толькі пры ветры да 14 м/с. Нямецкія краны па кантэйнерах дазваляюць не спыняць пагрузку-разгрузку нават пры ветры да 20 м/с. А італьянскія рычстакеры могуць працаваць практычна пры любых умовах надвор'я. Менавіта таму па кантэйнерным абслугоўванні станцыя Калядзічы складзе сур'ёзную канкурэнцыю любому іншаму транспартна-лагістычнаму цэнтру краіны.

ПРАЦА «ПАД КЛІЕНТА»

Дырэктар цэнтра «Мінск» упэўнены, што, маючы такія плошчы пляцовак і сучаснае абсталяванне і тэхніку, станцыя Калядзічы мае магчымасць працаваць не толькі ў штатным рэжыме свайго запланаванага графіка, але і значна паскараць працэсы апрацоўкі грузаў па жаданні заказчыка. Працаваць, так бы мовіць, «пад кліента». Напрыклад, тыдзень таму на станцыю прыбыло 70 вагонаў металу з Украіны, якія неабходна было максімальна хутка разгрузіць. Звычайна станцыя працуе на такіх работах па 12 гадзін на суткі — з 8 гадзін раніцы да 20.00. А ў гэтым выпадку ў Калядзічах была арганізавана начная змена, што дазволіла літаральна за двое сутак справіцца з 70 вагонамі.

Асобна Сяргей Швыроў падкрэсліў, што цяжкавагавая пляцоўка ўжо цяпер працуе практычна на максімуме. Калі яе планавая ёмістасць складае 9,5 тысячы тон грузаў, то цяпер на ёй знаходзіцца 10,5 тысячы тон металу. Кожны дзень тут адгружаецца больш за 20 машын.

СКЛАД ТРОХ ЛІНІЙ

Падобнага сучаснага памяшкання на станцыі да рэканструкцыі не было. А сёння пабудаваны склад дазваляе прыняць і перапрацаваць да 50 тысяч тон грузаў. Агульная ёмістасць склада складае каля 5 тысяч тон розных малагабарытных грузаў, што дазваляе штосутачна разгружаць туды каля 20 вагонаў. Паводле слоў Сяргея Швырова, унікальнасць гэтага склада ў тым, што ён можа адначасова прымаць і сартаваць грузы, якія прыходзяць вагонамі па чыгунцы, фурамі — аўтамабільным транспартам і па лініі кантэйнернай транспарціроўкі. Больш за тое, структура склада (яго сучасная пляцоўка) дае магчымасць «перакідваць» тавары і па прамым варыянце — непасрэдна з аўтамабіля ў вагон ці наадварот.

ДАХОДЫ І АКУПНАСЦЬ

Паэтапная мадэрнізацыя гарадской таварнай станцыі Калядзічы абышлася транспартна-лагістычнаму цэнтру ў 440 млрд рублёў. У асноўным, гэта крэдытныя рэсурсы і пазычаныя сродкі з боку Беларускай чыгункі.

Дырэктар цэнтра «Мінск» лічыць, што даходнасць мадэрнізаванай станцыі планава павялічваецца. Калі ў 2012 годзе ў Калядзічах на кліентах зарабілі 18 млрд рублёў, у 2013-м — 22 млрд, у 2014-м — 26 млрд, то сёлета разлічваюць атрымаць агульны даход у памеры каля 30 млрд рублёў.

Згодна з бізнес-планам, тэрмін акупнасці праекта складае 17,5 года. Аднак кіраўніцтва станцыі плануе цалкам разлічыцца з крэдытамі значна раней, а потым і выйсці на чысты прыбытак прыкладна праз 10-12 гадоў. Кампанія плануе канкурыраваць на рынку за кошт прадастаўлення зніжак і комплексных паслуг. Пасля праведзенай мадэрнізацыі станцыя ажыццяўляе пагрузачна-разгрузачныя работы, мытнае афармленне, захоўванне, выдачу і пераадрасоўку грузаў, прамежкавую апрацоўку грузаў у крытым складзе і мацаванне іх на рухомым саставе, а таксама аўтамабільную дастаўку.

ДАВЕДКА

Гарадская таварная станцыя Калядзічы ўваходзіць у структуру транспартна-лагістычнага цэнтра «Мінск», які з'яўляецца філіялам Рэспубліканскага транспартна-экспедыцыйнага ўнітарнага прадпрыемства «Белінтэртранс-транспартна-лагістычны цэнтр» (БТЛЦ) Беларускай чыгункі.

Дзяржаўнае прадпрыемства БТЛЦ мае 5 прадстаўніцтваў за мяжой — у Расіі, Літве, Германіі, Польшчы і Кітаі. Акрамя таго, ва ўсіх абласных цэнтрах Беларусі функцыянуюць яго філіялы.

ЗНАКАВАЕ ЗВЯНО ДЛЯ ЧЫГУНКІ

Станцыя Калядзічы стала даволі буйным звяном у арганізацыі грузавых перавозак Беларускай чыгункі. Тут адбываецца апрацоўка і перавалка грузаў экспартна-імпартных зносін, а таксама адпраўка грузаў у краіны Балтыі, СНД і далёкага замежжа. Акрамя таго, на тэрмінале апрацоўваюцца грузы, якія прыходзяць кантэйнернымі і камбінаванымі цягнікамі «Вікінг» і «Зубр», расказвае Уладзіслаў Лембіеўскі. Прыкладна 80% грузаў сёння са станцыі апрацоўваецца і накіроўваецца далей у рэгіёны Беларусі. А 20% з агульнага аб'ёму загрузкі станцыі праходзіць праз яе транзітам, калі тавары тут апрацоўваюцца і адпраўляюцца далей, у трэція краіны. Як правіла, гэта тавары народнага спажывання, якія перавозяцца з Еўропы ў краіны СНД.

Кліентамі транспартна-лагістычнага цэнтра з'яўляюцца такія прадпрыемствы, як МАЗ, «Мотавела», «Алютэх», «Гарызонт», «Вентоспа», «БелДжы», «Метінвест» і іншыя кампаніі.

«Сёння агульная карысная плошча кантэйнерных пляцовак №1 і №2 дасягнула 30 тысяч «квадратаў», а іх агульная перапрацоўчая здольнасць павялічылася да 100 тысяч кантэйнераў у ДФЭ за год».

У найбліжэйшай перспектыве лагістычны комплекс «Калядзічы» будзе прадстаўлены на беларускім транспартным рынку ў якасці «сухога порта», які мае сувязь з марскімі партамі праз арганізаваную транспартную інфраструктуру, паведаміў **намеснік начальніка службы грузавой работы і знешнеэканамічнай дзейнасці Беларускай чыгункі Аляксандр ЛІЗУНОЎ.**

Паводле яго слоў, тэхналогія «сухога порта» значна пашырае магчымасці і спрашчае ажыццяўленне кантэйнерных грузаперавозак для ўдзельнікаў знешнеэканамічнай дзейнасці, тэрытарыяльна размешчаных на значным выдаленні ад партоў.

Магутнасці тэрмінала станцыі Калядзічы запатрабаваны аператарамі марскіх ліній, якія карыстаюцца паслугамі захоўвання гружаных і парожніх буйнатанажных кантэйнераў, а таксама грузаў, што дастаўляюцца (у тым ліку кантэйнернымі цягнікамі). Цяпер наладжана ўзаемадзеянне з шэрагам буйных балтыйскіх партоў (Клайпеда, Вентспілс, Талін, Рыга) і партоў Чорнага мора (Адэса, Ілычоўск).

Акрамя таго, Беларуская чыгунка праводзіць работу па наладжванні супрацоўніцтва з найбуйнейшым на паўднёвым узбярэжжы Балтыйскага мора портам Гданьск (Польшча), які злучае скандынаўскія краіны з Паўднёва-Усходняй Еўропай. Рэалізацыя гэтых планаў у будучыні дазволіць стаць тэрміналу Калядзічы паўнавартасным міжнародным перавалачным хабам.

КІТАЙСКІ ВЕКТАР

Сёння роля тэрмінала «Калядзічы» ўзрастае і з улікам інтэнсіўнага росту дзелавой актыўнасці паміж Беларуссю і Кітаем, а таксама пры рэалізацыі «Канцэпцыі і плана дзеянняў па садзейнічанні будаўніцтву эканамічнага паяса Шаўковага шляху».

Тут прыкладамі эфектыўнага супрацоўніцтва дзяржаўнага прадпрыемства «БТЛЦ» у сферы аказання транспартна-лагістычнага сэрвісу кітайскім арганізацыям ужо з'яўляецца супрацоўніцтва з такімі кампаніямі, як «БелДжы», CUEC і NCPE. Для іх грузы дастаўляюцца з выкарыстаннем марскога, чыгуначнага і авіяцыйнага транспарту на тэрмінал «Калядзічы», дзе аказваюцца паслугі па іх мытным афармленні, апрацоўцы, захоўванні і дастаўцы аўтатранспартам да месца прызначэння.

Не менш важным напрамкам арганізацыі перавозак грузаў у зносінах з Кітаем з'яўляецца развіццё імпартных і экспартных перавозак. У тым ліку цяпер ёсць вялікі патэнцыял развіцця экспартна-імпартных перавозак у зносінах з Кітаем у кантэйнерах. Сёння гэтыя перавозкі пераважна ажыццяўляюцца праз парты Балтыйскага мора (у асноўным праз Клайпедскі), а таксама праз чарнаморскія парты Украіны. Разам з тым сухапутныя перавозкі грузаў чыгуначным транспартам у параўнанні з марскімі маюць відавочную перавагу — хуткасць дастаўкі. Напрыклад, прамыя чыгуначныя зносіны значна скарачаюць адлегласць перавозкі грузаў у зносінах Беларусь — Кітай, пры гэтым тэрмін дастаўкі скарачаецца ўтрая. У сувязі з гэтым перад Беларускай чыгункай стаіць важная задача па аптымізацыі лагістыкі паставак на ўсім сухапутным шляху.

Выгаднае геаграфічнае становішча станцыі Калядзічы стварае перадумовы для таго, каб ужо ў самы бліжэйшы час гэты грузавы тэрмінал стаў найважнейшым звяном сухапутных экспартна-імпартных перавозак грузаў кантэйнернымі цягнікамі ў зносінах Беларусь — Кітай — Беларусь.

Сяргей КУРКАЧ. *Мінск—Калядзічы.*
kurkach@zviazda.by

ВОСЬ ГЭТА ВУЛІЦА, ВОСЬ ГЭТЫ ДОМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Умоўна безгаспадарчую маёмасць можна падзяліць на 4 групы: уласнікі не ўстаноўлены; іх немагчыма знайсці; зусім няма ўласніка, але засталіся зарэгістраваныя жыльцы (дзеці пасля смерці бацькоў не ўступілі ў спадчыну); уласнікі адмаўляюцца наводзіць парадак, спасылаючыся на абмежаванасць у сродках. З пачатку года нядбайным жыльцам выдадзена больш за 900 прадпісанняў па навядзенні парадку. Якія вынікі? Летась, напрыклад, па 10 дамах нараканні былі зняты.

У найбліжэйшы час у спіс плануецца дадаць яшчэ і тыя будынкі, якія выкарыстоўваюцца пад дачы. Па апошніх падліках, гэта яшчэ каля 200 дамоў. На зіму іх уладальнікі пераязджаюць у кватэры, а гарадскія лецішчы становяцца аб'ектам павышанай увагі асацыяльных асоб.

— Збіраемся больш рашуча дзейнічаць у дачыненні маёмасці, уласнікаў якой нельга знайсці, — кажа Павел Марыненка. — Пачнём замацоўваць такія дамы за пэўнымі камунальнымі прадпрыемствамі, якія возьмуць на сябе абавязкі па падтрыманні тэрыторыі ў належным стане і будуць фарміраваць свае выдаткі па доглядзе. Калі знойдзецца ўласнік, прад'явіць рахунак — хай аплачвае. У іншым выпадку, прададзім участак з аўкцыёну і кампенсуем камунальнаму прадпрыемству выдаткі па кансервацыі аб'екта.

— А калі нашчадак з'явіцца і скажа, што не прасіў нікога даглядаць яго спадчыну?

— Любы ўчастак павінен апрацоўвацца, — аргументуе Павел Марыненка. — Калі не сачыць за парадкам, тэрыторыя зарастае пустазеллем, з якім вельмі цяжка змагацца. Яно распаўсюджваецца і на суседнія ўчасткі. І больш за ўсё непакоіць, што закінутым будынкам могуць скарыстацца крымінальныя асобы ці тыя, што вядуць бязладнае жыццё, бо яны здольныя і злачынства здзейсніць, і пажар учыніць.

Мы пастаянна звяртаемся да жыхароў: бачыце, што побач жывуць небяспечныя суседзі, або стаіць закінуты дом, паведамляйце. Гэта ж у вашых інтарэсах. Аддзел камунальнай гаспадаркі адкрыты для ўсіх. Дарэчы, страціць участак вельмі проста. Зямля ў горадзе карыстаецца вялікім попытам. Участкі да 15 сотак прадаваліся з аўкцыёну і па 400 мільёнаў рублёў.

КАНДЫДАТЫ НА ВЫСЯЛЕННЕ

Разам са спецыялістамі ЖКГ Кастрычніцкага раёна і супрацоўнікамі міліцыі едзем па адрасах нядбайных гаспадароў, якія не рэагуюць на спробы да іх дастукацца.

— Гэтыя спісы нам перадалі ратавальнікі, — тлумачыць **спецыяліст ЖРЭУ Кастрычніцкага раёна Алена ЛАПО.** Пакуль едзем, яна ўводзіць мяне ў курс справы: — Калі быць дакладным, мы шчыльна працуем з недагледжанымі дамамі ўжо з 2008 года. Першапачатковыя звесткі дала землеўпарадкавальная служба. Паступова яны дапаўняліся інфармацыяй па выніках рэйдаў міліцыі, ратавальнікаў, санітарнай службы, нашых размоў з суседзямі, вулічкамі, дэпутатамі. Вось цяпер правяраем факты, атрыманыя ад супрацоўнікаў МНС. Перад тым, як ехаць, даведаліся ў РКЦ, хто там жыве і як разлічваюцца за камунальныя паслугі, заадно пацікавіліся ў землеўпарадкавальнай службы, ці ёсць там уласнікі. Трэба ацаніць стан кожнага дома, скласці акт камісійнага абследавання, апытаць суседзяў. Меры будуць прымацца ў залежнасці ад сітуацыі. Калі дом гарэў — гэта адно, а калі доўгі час стаіць без гаспадара — зусім іншае. Апошнія на афіцыйнай мове называюцца вымарачнымі. Але, каб дом атрымаў такі статус, трэба перадаць справу ў суд.

Прыпыняемся каля аднаго з дамоў, пазначаных ратавальнікамі як небяспечны. На першы погляд ён нічым не горш за астатнія. Вось толькі вакол яго не прыбрана, пад вокнамі звалены ў кучу старыя шыны, часткова няма агароджы, на агародзе пустазелле амаль у чалавечы рост. На дзвярах замок. Адзіны, хто нас гасцінна сустракае, гэта кот.

— У доме калісьці жыла Лідзія Віцянкова, якая памерла ў 2004 годзе, — чытае «дасье» на ўладальнікаў Алена Лапо. — Тут зарэгістраваны яе дачка 1979 года нараджэння і ўнук.

У пошуках адказаў, жывуць яны тут ці не, ходзім вакол дома. Разабрацца цяжка. Бо не верыцца, што можна існаваць у такіх, мякка кажучы, антысанітарных умовах. Амаль каля самага дома сметнік, ад якога ў спякотны дзень па акрузе распаўсюджваецца характэрнае амбрэ.

Але са слоў суседа высвятляецца, што людзі тут усё ж такі жывуць.

Вось што адбываецца, калі дом 10 гадоў стаіць без гаспадара.

Чаму так нядбайна? Ніхто дакладна не ведае. Супрацоўнікам ЖКГ прыйдзецца знайсці іх і прымусіць навесці парадак. А гэта, бывае, займае не адзін дзень і нават месяц.

— Быў выпадак, калі дом па суседстве з будынкам адміністрацыі раёна прыйшоў у заняпад, — узгадвае Алена Лапо. — Нашчадкаў было шмат, яны ніяк не маглі вызначыцца, што рабіць. Адны хацелі яго прадаць, другія супраціўляліся. Час ішоў, дом разбураўся, пачаў псаваць агульны выгляд. Паўгода змагаліся, па чарзе кожнага выклікалі, звярталіся па месцы працы, размаўлялі з іх кіраўніцтвам. І толькі пасля ўсяго гэтага яны нарэшце знеслі згарэлую пабудову, пасадзілі агарод, зрабілі агароджу.

Нават кот абураецца тым, што ў гаспадароў у павеці.

Ідзём па наступным адрасе. Па звестках ратавальнікаў там у непатрэбным месцы складзіраваны дровы, паўразбураны гараж, трухлявая гаспадарчая пабудова. У двары брэша сабака, але людзі голас не падаюць. «Тут адміністрацыйны пратакол не перашкодзіла б скласці, вельмі ўсё запушчана, — лічаць прадстаўнікі камунальнай службы. — Адна справа, калі трэба дах перакрыць, а тут дастаткова навесці элементарны парадак. А для гэтага не столькі грошы патрэбны, колькі сумленне».

З першага погляду і не зразумееш, жывуць тут людзі ці не.

Суседка заступаецца, маўляў, гаспадыня хворая, ніхто ёй не дапамагае. «У жанчыны два дарослыя сыны. Дзе яны?» — пытаецца Алена Лапо. Высвятляецца, што адзін у Расіі працуе, другі недзе ў сяброўкі жыве. Хлопцам, дарэчы, 23 і 25 гадоў.

Пакуль ідзём да наступнага дома, Алена Лапо абураецца: «Як толькі людзі могуць жыць па суседстве з хламам? Я таксама з сельскай мясцовасці, але ў нас усё рабілася талакой, суседзі прыходзілі на дапамогу. А цяпер нават дзецям да сваіх жа бацькоў ніякай справы няма».

Наперадзе вымалёўваецца паўразбураная хата, амаль цалкам схаваная за зараснікамі. Дом спарахнеў да такой ступені, што яго лягчэй знесці, чым аднавіць. Людзі паціху сталі складаваць тут смецце. Маўляў, горш не будзе.

— Каб яго знесці, трэба вызначыцца з фінансаваннем і знайсці тэхніку, — уздыхаюць спецыялісты. — Хто гэта возьме на сябе? У сельскай мясцовасці, у адрозненне ад горада, выдаткі ўжо закладзены ў бюджэт сельсавета.

Чыя гэта спадчына, не ведаюць нават суседзі.

— Тут жылі старыя, гадоў дзесяць таму памерлі, — кажа тутэйшы старажыл. — Дзяцей у іх не было, але камусьці дом яны адпісалі. Толькі той нашчадак яго прадаў, а новыя гаспадары так і не засяліліся. Мясцовыя ж паціху пачалі разбіраць пабудову на кавалачкі. Я крыху абкошваю тэрыторыю, каб быў больш-менш прыстойны выгляд.

На развітанне мужчына паказвае яшчэ адзін асірацелы дом. Нашчадкі збіраюцца яго прадаць, але ён таксама можа трапіць у шэрагі неперспектыўных. І тады на вуліцы стане адным прывідам болей.

ГОРАДУ НЕ ХАПАЕ «СОТАГА» ЎКАЗА

Па выніках праверкі складзены прадпісанні, тэрміны іх выканання пастаўлены на кантроль. Калі нічога не зменіцца, нядбайных гаспадароў прыцягнуць да адміністрацыйнай адказнасці. І так па коле. Трэба неяк уплываць на ўласніка — хадзіць, прасіць, прыцягваць да адміністрацыйнай адказнасці — адным словам, ставіць у такое становішча, каб ён нешта пачаў рабіць: або навёў парадак, або адмовіўся ад сваёй маёмасці.

— Ёсць Правілы добраўпарадкавання і ўтрымання населеных пунктаў, іх ніхто не адмяняў, — кажа **начальнік аддзела ЖКГ і добраўпарадкавання адміністрацыі Кастрычніцкага раёна Сяргей МАКАРЭНКА.** — У любым выпадку пакасіць траву, паставіць агароджу і пафарбаваць яе — не такія ўжо і вялікія выдаткі.

Нельга сказаць, што клопаты дастаўляюць спрэс людзі, якія злоўжываюць спіртным, або дармаеды. Быў выпадак, калі ўласнік памёр, нашчадкі падалі заяву на ўступленне ў спадчыну, забілі ў доме вокны і раз'ехаліся па сваіх месцах жыхарства ў спадзяванні праз паўгода вярнуцца і заняцца справай. А прыехалі на папялішча — нехта спаліў іх дом. З аднаго боку, прамой віны іх няма, з другога — няўжо было цяжка паставіць сігналізацыю? Каб аднавіць дом, яго, па сутнасці, трэба зноў адбудаваць. У выніку нашчадкі пакідаюць усё, як ёсць, а камунальным службам прыходзіцца рабіць прадпісанні, каб неяк уздзейнічаць на людзей.

«Страціць участак вельмі проста. Зямля ў горадзе карыстаецца вялікім попытам. Участкі да 15 сотак прадаваліся з аўкцыёну і па 400 мільёнаў рублёў».

На сёння існуюць толькі 2 рычагі, якімі карыстаюцца спецыялісты — Зямельны і Грамадзянскі кодэксы. Калі ўчастак пэўны час не апрацоўваецца і не выкарыстоўваецца па прызначэнні, яго яшчэ можна канфіскаваць. Але калі там маецца пабудова, зарэгістраваная ў Агенцтве па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры, то тут Зямельны кодэкс ужо не дзейнічае. У Канстытуцыі прапісана, што грамадзянін мае права на ўласнасць і проста так забраць яе нельга. Нават тады, калі ад яе нічога, акрамя падмурка, не засталося.

— Калі б магчыма было ў гарадской мясцовасці прымяніць Указ №100, працаваць было б прасцей, — кажа Сяргей Макарэнка. — У бюджэце з'явіліся б сродкі на тое, каб набыць такі дом. Грошы адразу б вярнуліся пасля яго продажу на аўкцыёне. І астатнім нядбайным гаспадарам быў бы ўрок. Да чалавека хутчэй дайшло б, што калі ён не разбярэцца са сваім паўразбураным домам і не навядзе парадак на ўчастку, ён у выніку яго пазбавіцца.

Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара.
zigulya@zviazda.by

■ На слыху

РЭСТАРАТАРЫ ГРАШАЦЬ «КАНВЕРТАМІ»

Падатковай інспекцыяй па Маскоўскім раёне сталіцы была праведзена пазапланавая праверка прыватнай кампаніі «М», асноўны від дзейнасці якой — прадастаўленне паслуг рэстаранамі. Там была выяўлена шэрая схема «зарплаты ў канвертах», паведамляе прэс-служба падатковага ведамства.

На падставе заключэння, падрыхтаванага ўпраўленнем Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Беларусі па Мінскай вобласці і горадзе Мінску, выяўлены факт выплаты заработнай платы работнікам у суме больш як 186 млн рублёў з парушэннем вызначанага парадку вядзення бухгалтарскага ўліку («у канверце»). А ў выніку падатковым агентам прыватнай фірмы ў парушэнне дзейнага заканадаўства не былі ўтрыманы і пералічаны ў бюджэт падаходны падатак з фізічных асоб. Потым кантралёры сітуацыю выправілі і даналічылі юрыдычнай асобе падаходны падатак у суме 22,3 млн рублёў. Акрамя таго, рэстаратараў папярэдзілі, што падобнае паўторнае парушэнне стане падставай для больш жорсткага пакарання.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

ПАМІЛАВАННЕ Ў ДЗЕЯННІ

У краіне працягваюць рэалізоўваць закон аб амністыі, прымеркаваны да 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

У Дэпартаменце выканання пакарання МУС паведамілі, што на 10 ліпеня пытанне аб амністыі ўжо разгледжана ў дачыненні да 4239 асуджаных. Начальнікамі закрытых папраўчых устаноў вынесены пастановы аб вызваленні 1036 зняволеных, з якіх 25 — непаўналетнія. Вырашана таксама скараціць на год тэрмін зняволення 1.040 асуджаным. А вось з прычыны наяўнасці іскаў і злосных парушэнняў 2163 пазбаўленым волі ў амністыі давялося адмовіць.

Варта дадаць, што ў ходзе амністыі зняволеныя пакрылі страты на больш чым 1,5 мільярда рублёў.

Якаў ЖУРБІН. *taras@zviazda.by*

170 КГ НАСВАЮ — ВЫКЛЮЧНА ДЛЯ СЯБЕ?

Грамадзянін Узбекістана, які пражывае ў Гомелі, захоўваў 170 кілаграмаў насваю ў гаспадарчай пабудове свайго знаёмага. Супрацоўнікам міліцыі затрыманы 44-гадовы мужчына паведаміў, што партыю тытунёвага вырабу коштам 255 мільёнаў беларускіх рублёў ён прывёз тыднем раней з Расійскай Федэрацыі — выключна для сябе. Аднак яму не паверылі, склалі пратакол і канфіскавалі атруту. Грамадзяніну пагражае штраф у памеры да 50 базавых велічынь.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
astashkevich@zviazda.by

ПАКУЛЬ ЖОНКА НА ПРАЦЫ...

Супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі чарговы раз затрымалі ў Гродне так званага паўторніка — чалавека, для якога ранейшае пакаранне не служыць урокам на будучыню.

У яго выявілі прыкметы наркатычнага ап'янення, аднак затрыманы зноў адмовіўся ад медыцынскага агляду. Без ведама жонкі, якая знаходзілася на працы, мужчына ўзяў «Мазду» і, наведаўшы знаёмага, на праспекце Янкі Купалы праехаў на чырвоны сігнал святлафора. Аўтамабіль, які належыць жонцы, падлягае канфіскацыі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.
prakopchik@zviazda.by

Сумесны праект газеты «Звязда» і Міністэрства ўнутраных спраў

ФАРПОСТ СПАКОЮ

№ 7 (15)

«СКЛАДАНЫХ» ПАДЛЕТКАЎ СТАНОВІЦЦА МЕНШ

Сёлета адбыўся нязначны рост колькасці павелічэння злачынстваў з удзелам непаўналетніх на тэрыторыі краіны. Але Яўген АБРАМОВІЧ, намеснік начальніка аддзела прафілактыкі Упраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі ГУУС Мінгарвыканкама, лічыць, што напрыканцы года дынаміка будзе станоўчай:

— У Мінску каля 2 тысяч дзяцей, якія знаходзяцца на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх. Калі параўнаць з леташнімі паказчыкамі, колькасць падобных падлеткаў адчувальна знізілася. Змяніліся падыходы па індывідуальна-прафілактычнай працы. Акцэнты зроблены на тых, хто здзейсніў больш цяжкія злачынствы і правапарушэнні.

Спецыяліст таксама дадаў, што ўжо рыхтуюцца змены ў закон «Аб прафілактыкі безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх»: «У ім раней не прадугледзелі ўзрост, з якога непаўналетні павінен стаяць на ўліку. Цяпер з гэтым паказчыкам вызначыліся таксама і з катэгорыямі правапарушэнняў, з-за якіх будуць ставіць на прафілактычны ўлік».

Што тычыцца летняга адпачынку тых, хто трапіў у поле зроку супрацоўнікаў міліцыі, акцэнт зроблены на дзецях, што знаходзяцца ў складаных сацыяльных умовах. Адной з формаў адпачынку ўлетку з'яўляецца арганізацыя занятасці. Таксама для падобных дзяцей створаны летнікі.

Фота Надзеі БУЖАН.

РОВАР З ПРАБЛЕМАМІ

«У сталіцы ўсё зроблена для веласіпедыстаў»

Веласіпедысты працягваюць станавіцца ўдзельнікамі дарожна-транспартных здарэнняў. І як раней паведамлялі ў Дзяржаўтаінспекцыі, амаль палова ДТЗ адбываецца па віне гаспадароў двухколавага транспарту. У Мінску іх таксама хапае. У праблеме спрабаваў разабрацца карэспандэнт «Звязды».

Чарговае дарожна-транспартнае здарэнне з удзелам веласіпедыста зноў адбылося ў сталіцы. Дзесяцігадовы школьнік, жыхар вёскі Шчомысліца, выехаў на праезную частку са сцежкі па вуліцы Ландара (з боку чыгуначных пуцей) і трапіў пад колы маршруткі. Дзякуй Богу, хуткасць на гэтым участку дарогі не была высокай.

— Я размаўляў з яго бацькам, і ён кажа, што сам не разумее, як сын узяў ключы, адамкнуў гараж, забраў веласіпед і паехаў катацца разам з сябрам у Мінск, — кажа Сяргей Маслаў, старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе ДАІ Кастрычніцкага раёна сталіцы. — І тут узнікаюць пытанні. Як можна было са Шчомысліцы паехаць катацца ў Мінск? Нават для дарослага шлях няблізкі... Хлопчык зараз адчувае сябе нармальна. У яго была рваная рана. Наклалі тры швы. Урачы наогул ставілі дыягназ «пералом перадплечча», але ён не пацвердзіўся.

Як кажа Сяргей Маслаў, падобны выпадак для раёна вялікая рэдкасць. «Агулам за першыя 6 месяцаў у Мінску адбылося 11 дарожных здарэнняў з узделам веласіпедыстаў, 11 чалавек атрымалі пашкоджанні рознай ступені. Ніхто не загінуў. І мы стараемся рабіць усё для таго, каб падобныя выпадкі не паўтараліся. Дзеля гэтага праводзім вялікую работу з дзецьмі. Не кажучы ўжо пра дарослых, многія з якіх памянялі чатырохколавы транспарт на двухколавы».

— Да нашага раёна адносіцца пасёлак Сокал, які знаходзіцца за 20 кіламетраў ад горада, — працягвае суразмоўца. — Мы нават і там арганізоўваем працу. Абсталявалі для школьнікаў велапаркоўку, і цяпер дзеці на роварах могуць прыязджаць на вучобу.

Сітуацыю з дарослымі веласіпедыстамі Маслаў таксама не лічыць крытычнай.

— Яна кантралюецца. Мы шмат працуем з падобнай катэгорыяй і ладзім прафілактычныя мерапрыемствы. Ну а да непаслухмяных прымаем адміністрацыйныя санкцыі. Калі інспектар бачыць, што пры наяўнасці веладарожкі веласіпедыст спрабуе выехаць на праезную частку, парушальніка спыняе. На маю думку, у горадзе зроблена ўсё для веласіпедыстаў: і веладарожкі, і спецыяльныя зоны, у якіх можна свабодна пакатацца, не сустракаючыся з другім транспартам. І каб проста пакатацца, месцаў па ўсёй сталіцы хапае. У Кастрычніцкім раёне, напрыклад, веладарожку зрабілі ў раёне вуліцы лейтэнанта Кіжаватава, нанеслі спецыяльную разметку і ўсталявалі знакі.

Шанхайскім шляхам

Ягор Хвайніцкі, 27-гадовы вэб-дызайнер, кажа, што на ровары катаецца ўсё сваё свядомае жыццё, але па вуліцах пачаў ездзіць чатыры гады таму, калі жыў у Шанхаі. Сябе адносіць да аматараў праехацца з ветрыкам, але пры гэтым імкнецца максімальна ацэньваць, што адбываецца вакол цябе.

— У Мінску для веласіпедыстаў створана адна гіганцкая веладарожка, якая пракладзена па адным маршруце. Даволі часта яна праходзіць праз пешаходную частку, а гэта ўжо не вельмі правільна. Бо на дарожках пастаянна бегаюць дзеці, якія ў любы момант могуць апынуцца пад коламі. Дзесяцісантыметровы бардзюр — гэта перашкода не толькі для веласіпедыстаў, але і для інвалідаў. Пры гэтым мне падабаецца, што ў нас з'явіліся велапераходы, на якіх не трэба спешвацца. Дзякуй за гэта! Але, на маю думку, гэта зроблена ў асноўным для турыстаў.

У якасці альтэрнатывы Ягор прапаноўвае шанхайскі варыянт паласы для веласіпедыстаў, якая ад астатняга руху аўтамабіляў аддзелена агароджай. Добры варыянт асабліва для таго, каб папярэдзіць траўматычнасць і нежаданыя сустрэчы пешаходаў з велааматарамі, на якія так часта цяпер наракаюць.

— А як табе мінскія веладарожкі?

— Яны часцяком прызначаны выключна для велапрагулак. Але ў Мінску хапае людзей, якія па розных прычынах не могуць дазволіць сабе аўто альбо проста клапоцяцца пра сваё здароўе. І для такіх людзей маршурт «дом-праца» — гэта не шпацыр праз парк, а паездка па вуліцах горада з мэтай максімальна хутка дасягнуць пункту прызначэння.

Тарас ШЧЫРЫ.

ПАСТКА ГАНДЛЯРОЎ «ЖЫВЫМ ТАВАРАМ»

Кожны год у свеце праз іх рукі праходзіць ад 700 тысяч да 4 мільёнаў чалавек

Калі заходзіць размова пра падобныя злачынствы, у многіх адразу ўзнікаюць асацыяцыі з краінамі трэцяга свету. Беднымі рэгіёнамі, дзе чалавек гатовы нават развітацца з ныркай, каб выратаваць ад жахлівай галечы сям'ю. Аднак, як аказваецца, людзей сёння прадаюць і купляюць, як тэлевізары ў краме, нават у развітых дзяржавах. Нашу краіну гэта праблема таксама, на жаль, не абмінула.

«49% АХВЯР — ЖАНЧЫНЫ»

— Нягледзячы на двухсотгадовую адмену гандлю людзьмі, ён як сучасная форма рабства працягвае не проста існаваць, але і квітнець, — лічыць **Валянцін РЫБАКОЎ, намеснік міністра замежных спраў Беларусі.** — І моцна ўтрымлівае пазіцыі ў крымінальным свеце па прыбытковасці пасля наркагандлю і гандлю зброяй. Гэтая праблема набыла рэальныя маштабы, закранула інтарэсы практычна ўсіх рэгіёнаў свету.

Цытата чыноўніка лёгка падмацоўваецца інфармацыяй Упраўлення Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па наркотыках і злачыннасці: з 2010 па 2012 год ахвяры ад падобнага злачынства выяўлены ў 124 краінах свету. Сярод іх былі выхадцы 154 дзяржаў.

Большасць з іх трапляюць у сексуальную эксплуатацыю, аднак многіх прымушаюць і да злачыннай дзейнасці. Амаль 50 працэнтаў ад усіх ахвяр — жанчыны.

Што тычыцца нашай краіны, праблема хоць і актуальная, але як запэўнівае Рыбакоў, яна востра ў нас не стаіць. Пры гэтым Беларусь даўно ўваходзіць у міжнародную сістэму па барацьбе з гандлем людзьмі.

— Беларусь першай на постсавецкай прасторы прызнала наяўнасць гандлю людзьмі на сваёй тэрыторыі, — дадае намеснік міністра. — Сіла нашай нацыянальнай мадэлі па барацьбе з падобным злачынствам заключаецца ў тым, што мы працуем на папярэджанне праблемы, а не змагаемся з наступствамі. Мы можам ганарыцца тымі поспехамі, якія наша краіна дасягнула ў барацьбе з гандлем людзьмі, з упэўненасцю казаць, што мы рухаемся ў правільным кірунку.

«МНОГІЯ ЎСВЕДАМЛЯЮЦЬ, ШТО БУДУЦЬ АКАЗВАЦЬ ІНТЫМНЫЯ ПАСЛУГІ»

Нягледзячы на гэтыя словы, працы ў праваахоўнікаў у гэтай нялёгкай справе хапае. За апошняе дзесяцігоддзе ў Беларусі ліквідавалі 22 міжнародныя крымінальныя арганізацыі, асудзілі больш 2 тысяч так званых трафікёраў, гандляроў людзьмі, выявілі 5170 ахвяр падобнага гандлю. Толькі за гэты год зафіксавана амаль 500 такіх злачынстваў. А гэта на 40 працэнтаў больш, чым летась.

— Сёлета спынена 7 спроб вывазу беларусаў за мяжу: 6 з іх у Расію, адна — у Аб'яднаныя Арабскія Эміраты. У Жлобіне затрымалі мясцовую жыхарку, якая праз сеціва вербавала і спрабавала вывезці ў Іарданію для заняткаў кансумацыяй у тамтэйшых клубах 4 дзяўчат. За кожную ёй паабяцалі ганарар у памеры 300 долараў штомесяц, — расказвае **Сяргей КОЛТУН, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі МУС.** — Пры гэтым мы актыўна змагаемся з сексуальнай эксплуатацыяй (64 працэнты пацярпелых падвяргаліся падобнаму прыгнёту ў межах нашай краіны).

Па статыстыцы, беларускі найчасцей траплялі ў інтымнае рабства ў Расіі, Германіі, Францыі, Польшчы, Нідэрландах.

— А як сёння заахвочваюць сутэнёры дзяўчат на працу прастытуткамі за мяжой? — спыталі журналісты ў Сяргея Колтуна.

— Формы і метады мяняюцца. Калі разваліўся Савецкі Саюз, многія нашы грамадзянкі марылі працаваць у іншых краінах. Падманам ім абяцалі працу гувернанткамі, афіцыянткамі. Яны траплялі ў бардэлі, масажныя салоны. Фактычна амаль усё зводзілася да заняткаў прастытуцыяй. Сёння жанчыны, якіх вярбуюць, так ці інакш дапускаюць, што будуць аказваць такія паслугі. І, на жаль, яны не разумеюць, што могуць трапіць у даўгавую кабалу, пад сістэму штрафаў...

Сёння многіх жанчын спрабуюць завербаваць праз інтэрнэт. І трафікёры, сутэнёры стараюцца не перасякаць мяжу з нашай краінай. «Яны ведаюць нашы суровыя пакаранні. І імкнуцца прымаць «жывы тавар», знаходзячыся ў краіне прызначэння», — кажа прадстаўнік МУС.

АБЯЦАЛІ СКАРМІЦЬ МЯДЗВЕДЗЯМ

Такое паняцце як «секс-турызм» таксама не абышло бокам нашу краіну. І за падобнае «прадпрымальных» у нашай краіне ўжо судзілі.

— Быў выпадак, калі нашых грамадзян вывозілі на турбазу суседняй краіны, дзе яны аказвалі сексуальныя паслугі, — працягвае Сяргей Колтун. — Прычым умовы іх утрымання былі даволі жорсткія. Гучалі нават пагрозы накшталт: «Скармлю мядзведзям!» і гэтак далей. Нядаўна на 7 гадоў за арганізацыю секс-турызму асудзілі жыхара Турцыі. Праз нейкі час такі ж тэрмін атрымаў яго суайчыннік. Яны ладзілі адмысловыя туры на выхадныя дні не для сузірання краявідаў, прыгожых мясцін Беларусі, а для адпачынку на здымных кватэрах разам з прастытуткамі. Кошт падобнага тура ад 3 да 5 дзён складаў тысячу долараў ЗША.

Сярод апошніх прыкладаў у нашай краіне — дзікая гісторыя былых зняволеных, якія выкарыстоўвалі форму супрацоўнікаў міліцыі, гвалцілі, здзекваліся з прастытутак. На Гродзеншчыне сёлета затрымалі дзвюх жанчын, што здзекваліся са сваіх дзяцей: адна маці рабіла порнаролікі з удзелам 6-гадовага сына для закрытых інтэрнэт-форумаў педафілаў, а другая прымушала 11-гадовую дачку займацца сексам з фермерам. Усе злачынцы арыштаваныя.

На жаль, і злачынстваў, звязаных з педафіламі, таксама хапае. Падобных сёлета ўжо зафіксавана звыш 120. Але радуе, што расце працэнт раскрыцця і ўсё больш вычварэнцаў нясуць заслужанае пакаранне.

Многія з пералічаных выпадкаў сведчаць не толькі пра жорсткасць людзей, але і пра даверлівасць тых, хто гатовы верыць любой аб'яве, каб адправіцца на заробкі. Пры гэтым у Беларусі ўжо 12 гадоў дзейнічае бясплатная «гарачая лінія» па пытаннях бяспечнага выезду за мяжу, на якой адказваюць на любыя пытанні наконт знаходжання «за кардонам». А таму яшчэ раз падумайце, ці апраўдана гэта рызыка? Калі сумняваецеся, звярніцеся па параду да кампетэнтных органаў. Гэта можа не толькі палегчыць вам жыццё, але і захаваць нервовыя клеткі вашым сваякам.

Тарас ШЧЫРЫ.
Фота Надзеі БУЖАН.

ШТО РАБІЦЬ, КАБ ЗАСЦЕРАГЧЫСЯ АД НЕБЯСПЕКІ ПАДЧАС ЗНАХОДЖАННЯ ЗА МЯЖОЙ?

- ✓ Не аддавайце свой пашпарт у чужыя рукі.
- ✓ Калі ўмовы вашага знаходжання адрозніваюцца ад тых, што былі ўказаны ў пагадненні аб працаўладкаванні, звяжыцеся з агентам ці чалавекам, які з'яўляецца вашым пасярэднікам. Патрабуйце паляпшэння ўмоў. Калі сітуацыя не зменіцца, вы можаце адмовіцца ад працы па дагаворы.
- ✓ Перыядычна падтрымлівайце сувязь са сваімі сваякамі і сябрамі. Аператыўна інфармуйце іх аб любых зменах вашага знаходжання. У выпадку крадзяжу дакументаў альбо пры ўзнікненні пэўных праблем звяртайцеся ў дыпламатычнае прадстаўніцтва Беларусі ці ў паліцыю краіны, дзе вы знаходзіцеся.

«ПРА НАШУ ПРАЦУ МОЖНА І КІНО ЗНЯЦЬ»

Карэспандэнты «Звязды» даведаліся, як на перыферыі працуецца ўчастковым інспектарам

Раніца працоўнага панядзелка. Я сяджу ў кафетэрыі ў Смалявічах, п'ю гарбату і бачу, як амаль кожны трэці наведвальнік вітаецца з прадаўцом, нешта абмяркоўвае. Асаблівасць такіх гарадкоў у тым, што кожны пра ўсіх ведае ўсё. А інфармацыя па «сарафанным радыё» распаўсюджваецца з аднаго канца мястэчка ў другое вокамгненна. Вось і задумаўся: навошта мясцовым здзяйсняць злачынства, калі трымаць у таямніцы яго будзе амаль немагчыма? Тым не менш працы ў смалявіцкіх праваахоўнікаў хапае. Вось і на працоўным стале ўчастковага інспектара Віктара Шыліна, з якім сустрэліся праз паўгадзіны, — «боль грамадзян», ладны стос матэрыялаў, з якімі за сёння трэба разабрацца.

АД МАРДАБОЮ ДА САМАГОНКІ

— Жанчына спрабавала скрасці 450 грамаў вадкага мыла на птушкафабрыцы. Склалі пратакол. На лецішчы адчыніліся вароты, падрапалі мужчыну машыну — таксама напісалі заяву, — гартае матэрыялы Віктар Шылін, які на працы сёння ўжо з 8:30. — Нехта падчас распіцця спіртных напояў атрымаў у твар і зняў пабоі...

— Усё як паўсюль. А што з сябе ўяўляюць Смалявічы ў крымінальным сэнсе?

— Я не сказаў бы, што наш горад літаральна гудзе ад злачынстваў. Не, правапарушэнні галоўным чынам адбываюцца на лецішчах, якія ёсць у кожным сельсавеце. Там пастаянна нешта крадуць. Летам — закаткі, зімой — тэхніку, будматэрыялы. А ў райцэнтры цяпер прысвойваюць пераважна веласіпеды.

— Дык навошта гэта рабіць, калі ўсе адзін аднаго ведаюць?! Тым больш ровар лёгка ідэнтыфікаваць.

— Мясцовасць і сапраўды кампактная, але ўсё ж такі знаходзяцца тыя, хто вырашыў паквапіцца на чужую маёмасць. Выпадкі хуліганства таксама здараюцца. Вось нядаўна на старых могілках вандал патрушчыў помнікі, але яго хутка знайшлі.

Участковым інспектарам Віктар Шылін працуе ўжо тры гады. Кажа, што ў міліцыю пацягнула яшчэ падчас службы ў войску. За яго плячыма ўжо была сельскагаспадарчая адукацыя, аднак гэта зусім не перашкодзіла змяніць сваё жыццё. Цяпер у міліцыі адказвае за цэлы Пекалінскі сельсавет. Ён там як мясцовы Аніскін: яго ў вёсцы ведаюць усе, нумар тэлефона і фотаздымак размешчаны ў краме. А таму, калі што, не цураюцца тэлефанаваць участковаму нават уначы. Сам Віктар, дарэчы, жыве ў вёсцы Курганы і мясцовыя праблемы ведае добра.

— Вы ўжо адчулі, у чым уся цяжкасць працы вясковага ўчастковага міліцыянера?

— Участковы — гэта ўніверсальны салдат. Ён мусіць умець працаваць у розных кірунках. Трэба быць і добрым псіхолагам, у залежнасці ад сітуацыі размаўляць больш сурова ці мякка. Цяжкасць, насамрэч, адна — вялікая нагрузка. Праўда, у густанаселеных гарадах, як мне здаецца, ва ўчастковых працы яшчэ больш. Там і менталітэт у людзей іншы. Але Пекалінскі сельсавет адносна спакойны.

— Аднак вы ведаеце, колькі легендаў, напрыклад, ходзіць пра сельскія дыскатэкі?

— Так, і ў вёсцы Кляннік невядомыя ў масках нядаўна прыехалі на дыскатэку, збілі мясцовага дыджэя, пашкодзілі яго машыну і з'ехалі. На Новы год моладзь таксама бадзялася па вёсцы да самай раніцы. Мне тэлефануюць і кажуць, што «ў нас мардабой».

— У вас няма адчування, што многія падобным займаюцца таму, што адчуваюць беспакаранасць за свае ўчынкі?

— Не, людзі ўсё ж такі разумеюць, што за правапарушэнне пагражае адказнасць, штраф. А зарплаты ў многіх цяпер невялікія, таму многія сталі больш стрыманымі, дысцыплінаванымі.

— П'янства на вёсцы, відаць, праблема актуальная?

— Раз на месяц праводзім у вёсцы з удзелам грамадскасці пасяджэнне савета прафілактыкі. Выклікаем праблемных жыхароў. Кожны месяц прыходзяць амаль адны і тыя ж людзі. Большасць злачынстваў, хатніх скандалаў тут адбываюцца з-за п'янства. Падобныя пратаколы складаю пастаянна. Апошні — літаральна тыдзень таму. Затрымалі аднаго не вельмі добрага чалавека: буяніў, крычаў, лез біцца да жонкі.

— У лячэбна-працоўныя прафілакторыі накіроўваеце такіх персанажаў?

— Накіроўваем, але многія вяртаюцца і не могуць адаптавацца да нармальнага жыцця. Адзін мужчына пасля вяртання ў п'янках не быў заўважаны, але на працу ўладкавацца не можа. Кажа, што з-за ЛПП ніхто браць яго не хоча. Не ведаю, што будзе. Трэба ўсё ж такі пад'ехаць у якую-небудзь гаспадарку, пагаварыць, каб працаўладкавалі. Калі не атрымаецца, будзем прымаць іншыя меры.

— З самагонаварэннем таксама прыходзіцца змагацца?

— У мяне на яго ўжо нюх. Калі адчуваеш пах, міма дома не пройдзеш. Не люблю, калі пачынаюць хлусіць. Быў адзін эпізод нядаўна. Чую, што пахне самагонам, заходжу ў дом, а гаспадары мне кажуць, што ніякага самагона ў іх няма. Праходзім на кухню, а там уключана пліта, стаіць вялізны бідон і вадкасць з трубкі ў слоік капае.

— А дзе цяпер звычайна хаваюць самагонку?

— У хлявах, лазнях, гаспадарчых прыбудовах. Прыкрываюць дровамі і думаюць, што нічога не відаць. Але пах усё роўна ўсё выдае. Часам нам тэлефануюць неабыякавыя людзі і дакладна распісваюць, дзе, хто гоніць самагонку. Ну а нехта проста на кагосьці крыўду мае, што не пазычыў шклянку, вось і здаюць сваіх «знаёмых».

— А ці становяцца жанчыны прычынай буйных сварак?

— Ёсць у мяне адна сям'я ў вёсцы Слабада. У іх там сапраўдная «Санта-Барбара». Здавалася б, людзі немаладыя. Але калі здараюцца рознагалоссі, ён збіраецца і ідзе на другі край вёскі да сваёй палюбоўніцы. Ну а пасля мне тэлефануе гэтая жанчына і кажа: «Зрабіце што-небудзь! Яго жонка прыбягае, скандаліць і папракае, што я звяла мужыка. А я ж не вінаватая. Ён сам прыходзіць!». Праўда, ужо некалькі месяцаў навін ад іх няма. Спадзяюся, памірыліся.

Аб нашай працы можна зняць кіно! Толькі трэба матэрыялу сабраць, пасядзець, падумаць, а так фільм можа нядрэнным атрымацца.

ТАВАРЫШ С. ЛЮБІЦЬ ГОРКУЮ

На гадзінніку каля 12. Разам з Віктарам Шыліным садзімся ў яго службовы «джылі» і едзем у невялікую вёску Заказінец праведаць мясцовага жыхара, які знаходзіцца на прафілактычным уліку ў раённым аддзеле ўнутраных спраў. Ён працуе вартаўніком на мясцовай ферме, але кіраўніцтва часам тэлефануе ў міліцыю і скардзіцца, што пасля атрымання заробку не прыходзіць на працу. Ён не буяніць, але выпіць любіць.

Дом, дзе жыве мужчына, здаецца недабудаваным. Хаця ўсё наадварот. Да такога стану яго давёў сам гаспадар. Вокнаў няма. Аконныя праёмы залеплены поліэтыленам. На стук у дзверы адчыняе сам гаспадар — сталы мужчына, з выгарэлымі ад курэння вусамі.

— Нейкі час піў бязбожна, — кажа ўчастковы міліцыянер, стоячы на парозе хаты.

— Але справіўся, — перарывае яго наш суразмоўца. — І ніякіх спрэчак няма. Так, піў раней. Раней жа «брыгада» была, — у голасе С. пачуліся ноткі настальгіі. — А цяпер усе закадзіраваліся.

— А вы чаму гэтага не зрабілі?

— А навошта, калі бачу, што не дапамагае. Праходзіць нейкі час, людзі зрываюцца, а пасля ходзяць з такімі галовамі, — кажа мужчына і малюе рукамі над сабой галаву памерамі з вялізны кавун.

Вартаўнік абяцае, што абавязкова сёння выйдзе на працу а сёмай вечара, і вяртаецца ў дом, дзе яго чакае абед ці запознены сняданак.

— Праца ў нас складаная, але мне яна падабаецца, — на адваротным шляху ў Смалявічы кажа Віктар Шылін. — Нехай гэта і гучыць пафасна, але мне насамрэч хочацца прыносіць карысць людзям, дзяржаве. Ёсць у мяне пэўныя мэты, звязаныя з працай. Некаторыя з іх ужо ажыццявіліся. Але адно магу сказаць дакладна: назад дарогі ўжо няма.

Тарас ШЧЫРЫ,
Смалявіцкі раён.



Фота Надзеі БУЖАН.

СПІРТНОГА МЕНЕЙ, КАМЕР БОЛЬШ

Карэспандэнт «Звязды» даведаўся пра абмежаванне часу па продажы спіртнога, пра магчымае павелічэнне колькасці камер для назірання за парадкам, а таксама пра бяспечны рух веласіпедыстаў на Віцебшчыне.

Калі ў Прыдзвінскім краі забаранілі ўначы рэалізоўваць спіртное, навіну актыўна абмяркоўвалі. Цяпер ёсць новая нагода для дыскусій.

— Ініцыюем, каб губернатар распарадзіўся забараніць рэалізацыю спіртнога з 21.00 да 9 гадзін раніцы. Ды і днём, упэўнены, трэба паменшыць колькасць месцаў, дзе можна купіць алкаголь. Напрыклад, ля плошчы Перамогі ў парку Пераможцаў створана добрая інфраструктура для сямейнага адпачынку, у першую чаргу для дзяцей. І тут жа прадаюць спіртное з усімі наступствамі. А дзецям мы павінны паказваць зусім іншыя прыклады. Кругласутачна алкаголь больш не прадаецца ўжо некалькі гадоў. Лічу, што гэта было зроблена правільна, бо п'янства — пагроза грамадству. Удумайцеся толькі: кожнае трэцяе злачынства здзяйсняецца ў стане алкагольнага ап'янення! А такія злачынствы, як забойства, прычыненне цяжкіх цялесных пашкоджанняў, практычна на 80% здзяйсняюцца нецвярозымі, — распавядае **начальнік Упраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама, генерал-маёр Віктар СЯНЬКО.**

Статыстыка, якую ён агучыў, не можа не ўстрывожыць. Сёлета накіраваны ў лячэбна-працоўныя прафілакторыі больш за 570 грамадзян, у тым ліку каля 135 жанчын.

— З кожным годам туды накіроўваем усё больш грамадзян. На ўліку ў медыкаў звыш 20 тысяч чалавек, якія пакутуюць на алкагалізм. Але, думаю, трэба лічбу памножыць мінімум на 10, — заўважае Віктар Сянько.

Каб паменшыць колькасць залежных ад алкаголю, праваахоўнікі прапагандуюць добраахвотнае кадзіраванне. У гэтым напрамку працуюць і з кіраўнікамі арганізацый і прадпрыемстваў, каб аплачвалі выдаткі. І ў выніку толькі сёлета больш за 3,3 тысячы чалавек добраахвотна звярнуліся да нарколагаў. Паводле ацэнак медыкаў, да 20% у выніку пазбавяцца ад залежнасці з выпіўкай...

Камер відэафіксацыі на Віцебшчыне стане больш.

— Лічу, што іх вельмі мала. Трэба, каб усе зоны адпачынку, уезды і выезды з горада былі пад назіраннем камер з якаснай «карцінкай». Мы падрыхтавалі адпаведны спіс неабходных месцаў іх размяшчэння. Камеры — гэта і прафілактыка парушэнняў, злачынстваў, мінімізацыя колькасці міліцыянераў, якія сочаць за парадкам на вуліцах, плошчах. Такім чынам мы трацім менш грошай і часу на раскрыццё злачынстваў... Школы і дзіцячыя садкі ў першую чаргу павінны быць забяспечаны адпаведным абсталяваннем. Зразумела, што грошай не хапае, але ёсць жа апякунскія саветы, бацькоўскія камітэты. У гэтым кірунку трэба больш шырока выкарыстоўваць пазабюджэтную дзейнасць устаноў адукацыі, — упэўнены Віктар Сянько.

Для прафілактыкі ДТЗ камер над дарогамі стане больш. Станоўчы вопыт Міншчыны, дзе раней служыў суразмоўца, паказвае: калі вадзіцелі атрымліваюць лісткі за перавышэнне хуткасці (з цэнтра фіксацыі правапарушэнняў. — **Аўт.**), становяцца значна больш дысцыплінаванымі... Змяншаецца і колькасць параненых, забітых аўто на дарогах.

Нядаўна ў Віцебску на праспекце Перамогі з'явілася першая ў горадзе веладарожка даўжынёй некалькі кіламетраў. Але ж, зразумела, што на веласіпедах ездзяць па ўсім горадзе.

— Проста нанесці на тратуарах спецыяльныя знакі, якія будуць указваць, што гэта дарожка для веласіпедыстаў, — не падыход... Патрэбна інфраструктура, пытанне неабходна вырашаць комплексна. Ёсць над чым папрацаваць, — пракаментаваў Віктар Сянько.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

Для мяне гэта чалавек з неспатольнай энергіяй, дарам валодання словам і, што самае рэдкае, — шчырым жаданнем зрабіць гэты свет крыху лепшым. Я заўжды задаюся пытаннем: адкуль у яго столькі сіл?

Іерэй Сергій ЦІМАШЭНКАЎ кіруе Сінадальным місіянерскім аддзелам Беларускай Праваслаўнай Царквы, служыць у храме ў гонар святога Мікалая Японскага ў Мінску, выкладае місіялогію і асновы царкоўнай сацыяльнай працы ў Мінскіх духоўных акадэміі і семінарыі, з'яўляецца загадчыкам лабараторыі місіянерскіх тэхналогій пры згаданай акадэміі. Колькасць людзей, якім ён дапамог і якіх прывёў да веры, складана падлічыць. А сам-насам мы сустрэліся падчас семінара «Місія і міласэрнасць», які з лёгкай рукі айца Сергія праводзіцца ўжо пяты раз і штолета збірае ў Жыровіцах сотню неабыякавых маладых людзей.

«СЛОВА «ПАВІНЕН» ПРЫХОДЗІЦЬ, КАЛІ ЗНІКАЕ ЛЮБОЎ»

— Айцец Сергій, давайце пачнем з самага галоўнага. Што такое місія і ўвогуле місіянерства?

— Сёння пад словам «місія» маецца на ўвазе ўсё, што хочаце. Місія арганізацыі, мэты яе існавання, ідэі, праграмы. Але ў разуменні праваслаўных місіянерства — гэта сведчанне аб Хрысце і веры. Сведчанне пра тое, што хрысціянства існуе, жыве і развіваецца. Што датычыцца мяне, то я лічу, што місіянерства — гэта свабоднае і натуральнае памкненне хрысціянскай душы, якое немагчыма спыніць. Уявім, што двое сустракаюцца. Адзін цалуе другога. Навошта? Можна сказаць, што гэта проста пацалунак і не больш. Але насамрэч такім чынам мы паказваем сваю любоў. Часам нават больш з-за таго, што не можам стрымацца ад пачуццяў. І незразумела, каму прыемней: таму, хто цалуе, ці таму, каго цалуюць. Так і тут. Нельга сказаць, што місія патрэбна пэўным людзям ці Царкве. Гэта натуральнае жаданне хрысціяніна, праява яго любові.

— Місіянерства — гэта абавязковая частка Царквы?

— Нецаркоўныя людзі малююць сабе такую карціну: місіянеры — сярэднявечныя прапаведнікі, якія некуды едуць па загадзе імператара для таго, каб пэўны народ звярнуць да веры. Часам нават царкоўныя не чулі і не ведаюць, што такое місіянерства. Але зараз у Царкве сталі раздавацца галасы: місія павінна быць, усе абавязаны гэтым займацца. Але такое стаўленне не вельмі адпавядае глыбіннай ідэі місіянерства. Слова «трэба», на мой погляд, адносіцца толькі да тых, хто нясе непасрэдную адказнасць — настаяцеляў і епіскапаў. А астатніх трэба натхняць. Бо «павінен» прыходзіць тады, калі знікае любоў. Мы ж клапоцімся аб сваіх бацьках, сям'і, але лічым гэта звыклым, нармальным, а не абавязкам. Закон патрэбен там, дзе няма любові.

«У мяне быў нехрысціянскі перыяд жыцця, і без яго мяне сённяшняга ўявіць немагчыма. Калі я заклікаю людзей не рабіць пэўных памылак, то, паверце, я ведаю, пра што кажу».

— Ці магчыма місіянерства паза Царквою?

— Сведчанне пра Хрыста заўжды ідзе ад душы. Але ў той жа час яно не можа быць пазацаркоўным. Усё ж такі Царква наўпрост звязана з традыцыяй, якая заклікае чалавека гаварыць і рабіць у пэўным рэчышчы духу. Таму праваслаўны місіянер ідзе заўжды ад Царквы. Як Бог Айцец пасылае ў свет Сына, той накіроўвае Дух, а Дух, у сваю чаргу, дапамагае апосталам быць пасланым ад Хрыста. Мы працягваем гэтую традыцыю, і атрымліваецца своеасаблівая пераемнасць пасланства. З аднаго боку, унутраная свабода, а з другога — абмежаванне канонамі Царквы, яе іерархічнасцю.

«Не кажу, што ўсё заўжды гладка. Вялікія царкоўныя справы, як танкавая гусеніца, праходзяць па нашай сям'і. Пасля чаго нашы адносіны патрабуюць натхнення, адпачынку і аднаўлення».

— Па якой структуры будуецца місіянерская праца ў Беларускай Праваслаўнай Царкве?

— Усё пачынаецца з сінадальнага місіянерскага аддзела. Яго задача — размеркаваць адказнасць, аб'яднаць, прасунуць, нават пралабіраваць інтарэсы малых ініцыятыў, якія ў гэтым маюць патрэбу. Абмежаваць шкодныя ідэі. Далей структура разгаліноўваецца ў ведамствы епархіяльных місіянерскіх аддзелаў. Святары, іх кіраўнікі, непасрэдна займаюцца місіянерствам на месцах. Пад іх кантролем усё: ад лекцыі ў школе да злёту ў сотні чалавек. Далей ім дапамагаюць памочнікі па місіянерскай працы благачынных, якія робяць тое ж самае, толькі на ўзроўні раёнаў. На жаль, пакуль гэтая сістэма не да канца ўкамплектаваная, але пэўны прагрэс ёсць.

— Але ж не ўсё можна ўпісаць у пэўныя межы...

— Так, ёсць і місіянерства па памкненні душы міран, якое не так лёгка «ўпісаць» у нейкія вялікія планы місіянерскіх аддзелаў . Тады яны аб'ядноўваюцца ў брацтвы і дзейнічаюць разам. Ці бываюць адзіночныя місіянеры, якіх бласлаўляе святар. Сказаць, што ёсць «ачагі», дзе місіянерскую працу можна вымераць і ацаніць, нельга. Бо ў нас не колькасная мерка, а якасная. Крытэрый накшталт «чым больш людзей прывёў да веры, тым ты лепшы» не дзейнічае. А глыбіня працы місіянера высвятляецца пры размове сам-насам. Часам на ўцаркаўленне аднаго чалавека можа пайсці часу больш, чым на цэлы раён. Гэта не значыць, што нізкі ККД. Бездань унутры нас павінна быць запоўнена. У кагосьці яна непамерна вялікая. Таму тут складана сказаць адназначна.

— Той, хто запаўняе «бездань» — які ён?

— Гэта даволі неадназначнае пытанне. Я б крыху скарэктаваў яго фармулёўку. Лепш сказаць — той, праз каго Гасподзь запаўняе бездань душы чалавека. Я выкажу выключна сваё суб'ектыўнае бачанне. У першую чаргу, гэта чалавек, які гарыць. Ён перапоўнены любоўю і абавязкова ведамі. Ён пастаянна ходзіць па лязе паміж Царквой і светам. Безумоўна, гэта чалавек, які памыляецца. Калі місіянер сустракаецца з кімсьці ўпершыню, то без «асечак» не абысціся — так лёгка не ўгадаць. Але самая галоўная якасць місіянера — гэта неасэнсаванне сябе такім, адсутнасць эгаізму, гордасці. Бо як можна сказаць «Я муж, які любіць сваю жонку» ці «Я добры пісьменнік»? Я, калі шчыра, сябе місіянерам так ні разу і не назваў. Але іншага — так. Маючы на ўвазе, што місіянер — гэта хрысціянін, які актыўна прапаведуе.

І вельмі важна, каб рэпутацыя была як мінімум добрая, але не ідэальна-нерэальная. Зразумела, што вобраз незямнога святара выклікае нейкі страх у людзей. Бо бывае, што звычайны чалавек мае думкі і жаданні, не сумяшчальныя з хрысціянствам, і разумее гэта (напрыклад, хоча змяніць пол), але расказаць пра іх «занадта правільнаму» бацюшку складана. У такіх выпадках чалавека можна перанакіраваць на старонку «УКантакце» іншага святара, жывога і вясёлага, да якога не страшна звярнуцца.

«Нельга атаясамліваць Царкву — Цела Хрыстова — з памылкамі людзей, якія знаходзяцца ў ёй. Як святароў, так і недухоўных».

— Вы сказалі «УКантакце», і я адразу ўзгадала, колькі часам агрэсіўных каментарыяў можна сустрэць да матэрыялаў аб праваслаўных на сайтах. Як да гэтага ставіцца місіянеру?

— Гэтая сітуацыя звязана шмат з чым. Напэўна, галоўная бяда — гэта крайняя даступнасць інфармацыі. Калі ўсё імгненна разлятаецца, і кожная мая памылка як святара становіцца вядома ўсім. Па-другое, чалавек, калі знаходзіцца ў інтэрнэт-прасторы, больш разняволены ў сваіх пачуццях. Бо калі ты размаўляеш ужывую, тады складаней разлавацца ці абурыцца. А ў інтэрнэце дастаткова націснуць некалькі кнопак. Таму віртуальная прастора становіцца лёгкім шляхам для таго, каб выліць усё, што ўсярэдзіне. А спецыялісты ў інтэрнэт-сферы змогуць расказаць і пра аплачаны тролінг, і пра заказныя матэрыялы. У любым выпадку тут галоўнае для місіянера — не паддацца эмоцыям, не ўцягнуцца ў бясконцую і амаль заўседы бессэнсоўную дыскусію і не старацца пераканаць у чымсьці іншага. Адзінае выйсце — пастарацца наладзіць дыялог, не кранаць пачуцці другога і, генерыруючы ідэі, выбраць адну, якая сапраўды зацікавіць чалавека. Я прыхільнік нармальнага тлумачэння сваёй пазіцыі, пры гэтым паважаючы погляды іншых.

«Часам на ўцаркаўленне аднаго чалавека можа пайсці часу больш, чым на цэлы раён. Гэта не значыць, што нізкі ККД. Бездань унутры нас павінна быць запоўнена. У кагосьці яна непамерна вялікая».

— Увогуле сучаснае стаўленне грамадства да праваслаўнай Царквы нельга назваць вясёлкавым. Чыя тут віна?

— Мяркую, што сапраўды бывае нагода адмоўна думаць пра святароў. Усё ж такі калі жыццё віруе, адбываецца тысяча падзей, тады і працэнт памылак значна большы. Праваслаўная Царква ў апошняе тысячагоддзе жыве вельмі актыўна, як і яе служкі. Не заўжды атрымліваецца адначасова быць добрым і прыемным для ўсіх. Але нельга атаясамліваць Царкву — Цела Хрыстова — з памылкамі людзей, якія знаходзяцца ў ёй. Як святароў, так і недухоўных. Але бывае і так, што чалавек праецыруе на бацюшку свае грахі. Ведаеце, як у той прыпавесці. Ідзе прахожы, бачыць сілуэт і думае: «Напэўна, хтосьці распуснічае». А пасля пачынае шукаць, як бы самому здзейсніць падобнае. Другі ідзе, бачыць цень і думае: «О, хтосьці збіраецца красці. Тут банк якраз недалёка...» А манах ішоў і падумаў, што чалавек вырашаў застацца адзін, каб памаліцца. Мы бачым адзін і той жа сілуэт, але кожны па-свайму яго ўспрымае.

— Нягледзячы на ўсе складанасці, чаму вы выбралі такі шлях?

— Гасподзь сам выбірае від нашага служэння, і я ніколі не планаваў займацца місіянерскай дзейнасцю. Раней 12 гадоў працаваў са складанымі падлеткамі і дзецьмі-сіротамі. Я разумею, што ў мяне да мяне самога ёсць пэўныя прэтэнзіі. Але няма магчымасці спыніцца на нейкі час для самавыпраўлення, таму прыходзіцца дзейнічаць, нібы запусцілі цябе ў раку — і плыві, як можаш. Думаю, што ўсё адбылося так, як і мае быць. У мяне быў нехрысціянскі перыяд жыцця, і без яго мяне сённяшняга ўявіць немагчыма. Калі я заклікаю людзей не рабіць пэўных памылак, то, паверце, я ведаю, пра што кажу.

— А як атрымліваецца сумяшчаць такое служэнне і сям'ю?

— Не думаю, што ў мяне гэта сапраўды атрымліваецца. Гэта заўжды кампраміс паміж роллю таты, мужа, гаспадара і працай. Як сістэма крэдытаў: пазыч мне зараз адно, я табе вярну ў іншым месцы і часе іншае. Прыходзіцца ўсё часцей забіраць час у сям'і, каб патраціць яго на штосьці іншае. Адзінае, з-за каго гэта магчыма, — гэта мая жонка, мая другая палова. Я сустракаю па жыцці шмат людзей і адэкватна іх ацэньваю. Але тую колькасць клопатаў, якая ляжыць на ёй, шматдзетнай маці, наўрад ці пад сілу падняць хоць аднаму з іх. Адкуль у яе столькі сілы? Не кажу, што ўсё заўжды гладка. Вялікія царкоўныя справы, як танкавая гусеніца, праходзяць па нашай сям'і. Пасля чаго нашы адносіны патрабуюць натхнення, адпачынку і аднаўлення.

«Адзін цалуе другога. Навошта? Можна сказаць, што гэта проста пацалунак і не больш. Але насамрэч такім чынам мы паказваем сваю любоў».

І яшчэ. Місіянерская праца не мае амаль нічога агульнага з матэрыяльным дастаткам. Але ёсць пэўнае нябеснае апекаванне, якое ратуе ў самых, здавалася б, бязвыхадных сітуацыях. У мяне ішло будаўніцтва дома, а я замест таго, каб ім займацца, аддаваў час царкоўным справам. Сітуацыя абвастралася, і акурат у гэты момант прыйшлі людзі, якія сказалі, што ведаюць пра маю праблему і згодны паўгода бясплатна папрацаваць. Гучыць неверагодна, праўда? Адчуванне, што ляціш на высокай хуткасці, трымаеш стырно, рэзка паварочваеш — а там яшчэ цікавей. І хто ведае, колькі такіх паваротаў чакае наперадзе?..

Вераніка ПУСТАВІТ.
pustavit@zviazda.by

Аляксандр АЛЕШКА:

«РАБІЦЬ ПАМЫЛКІ — АЗАРТНАЯ СПРАВА»

Вядомы расійскі акцёр кіно і тэатра, вядучы шматлікіх праектаў на тэлебачанні Аляксандр Алешка з юнага ўзросту марыў быць на сцэне. Сваю ролю ў гэтым, магчыма, адыграла і сустрэча з Алегам Паповым у Кішынёўскім цырку, калі той падарыў яму паветраны шарык, і іх фота трапіла ў мясцовую газету. Потым яно доўга вісела ў хлопчыка на сцяне. Артыст і сёння ўспамінае, як, пабываўшы ў лялечным тэатры, у музеі і потым апынуўшыся ў цырку, ён, савецкі хлопчык, убачыў неверагодную палітру фарбаў, творчасці, што і натхніла на выбар будучай прафесіі. Цяпер артыст сам з'яўляецца прыкладам творцы, які рэалізоўвае сябе ў розных праектах, прымярае новыя ролі і дзеліцца з аўдыторыяй сваімі эмоцыямі на сцэне...

Сёлета на «Славянскі базар» Аляксандр завітаў з уласным шоу. А пасля падзяліўся разважаннямі пра таленавітых людзей, самаіронію і «крытыкаў на канапе».

Фота Віктара НІКАЛАЕВА.

ЗАЎВАЖАЙЦЕ «БЕЛЫЯ ПАЛОСЫ»

— Нядаўна вы атрымалі званне заслужанага артыста Расіі. Наколькі важныя ў наш час такога кшталту ўзнагароды? Ці гэта толькі перажытак мінулага?

— Я не лічу прысваенне званняў перажыткам, бо для артыста такая адзнака важная. Але галоўнае не тое, што ў цябе ёсць званні і рэгаліі, з якіх ты пыл здзімаеш. Важна, калі маеш імя, творчы шлях, які разумеюць і прымаюць твае гледачы. Узгадваючы, напрыклад, Юрыя Нікуліна, мы адразу ўспамінаем не пра тое, што ён «народны артыст» Савецкага Саюза, а расплываемся ў добрай усмешцы ад таго, што ведаем артыста, які падзяліўся вялікай колькасцю дабрыні і святла з кожным сваім гледачом. І можна назваць шмат прыкладаў неверагодна таленавітых, годных, грандыёзных артыстаў, у якіх няма ніякіх званняў. Але гэта зусім не значыць, што яны бясследна існуюць або сышлі. Таму што кожны пакідае частку свайго жыцця, душы, музыкі, слоў у памяці гледачоў.

«Можна назваць шмат прыкладаў неверагодна таленавітых, годных, грандыёзных артыстаў, у якіх няма ніякіх званняў. Але гэта зусім не значыць, што яны бясследна існуюць або сышлі».

У дзяцінстве я меў план, як буду рэалізоўвацца. Калі б не разваліўся Савецкі Саюз, то я ажыццявіў бы яго. Склалася і так нядрэнна, але ўсё адбываецца нібы з нейкім спазненнем, з карэкціроўкай на час, на абставіны. Некалі я станавіўся на табурэтку і казаў: «Для вас спявае народны артыст Савецкага Саюза Саша Кабзон». Да такой перспектывы сябе рыхтаваў... Увогуле бывае так, што выходзіш пасля спектакля, у якім задзейнічаны народныя і заслужаныя, і нічога не адчуваеш, а іншы раз паглядзіш спектакль артыстаў без званняў, і на душы такі ўздым! Таму быць заўважаным прыемна, важна, але гэта не галоўнае.

— Ёсць думка, што глядач ходзіць «на акцёра» альбо «на рэжысёра» ў тэатр ... Які ваш пункт гледжання?

— Якая розніца? Хто на акцёра ідзе, хто на рэжысёра, а хтосьці проста хоча пайсці на сцены паглядзець. Для мяне не існуе такога пытання. Свет настолькі разнастайны! І таму я спакойна стаўлюся да любых пажаданняў аўдыторыі. Хай у кожнага будзе свой тэатр, свая дарога, свой артыст альбо рэжысёр. Выбірайце і жывіце спакойна. І не ганьце тое, што ёсць побач. У жыцці, сама такі шчаслівы момант — цяпер у КВЗ жартуюць пра мяне. Бываюць такія жарты, што ледзь з канапы не падаю. Але мне нават у галаву не прыходзіць ім тэлефанаваць, высвятляць узаемаадносіны. Я ўдзячны за такую ўвагу. У мяне пачуццё самаіроніі 150-працэнтнае. Люблю смяяцца з сябе.

ПРОСТА ЧАЛАВЕК, ЯКІ ШМАТ ПРАЦУЕ

— Ці няма ў вас адчування, што вас не да канца ацанілі?

— Я ніколі не назаву сябе «зоркай», бо для мяне гэта страшная пошласць. У нас цяпер куды ні паглядзі — усюды «зоркі». Я проста чалавек, які працуе ў тэатры, у кіно, шмат на тэлебачанні і ведае сваю дарогу, разумее, пра што хоча сказаць.

«Некалі я станавіўся на табурэтку і казаў: «Для вас спявае народны артыст Савецкага Саюза Саша Кабзон». Да такой перспектывы сябе рыхтаваў...»

У момант рабавання 59-гадовая работніца гандлёвай установы прыбірала памяшканне. Калі адзін са злачынцаў пачаў размахваць зброяй і запатрабаваў, каб жанчына аддала выручку з касавага апарата, супрацоўніца крамы накіравала на яго трубу ўключанага пыласоса. Пасля гэтага рабаўнікі ўцяклі. Інцыдэнт адбыўся а палове першай ночы, твары злачынцаў хавалі маскі. Гэта ўжо не першы выпадак, калі людзям удаецца адбіцца ад рабаўнікоў пры дапамозе пыласоса. Напрыклад, у 2011 годзе жыхарка амерыканскага штата Тэнесі здолела аказаць супраціўленне мужчыну, які залез у яе дом. Жанчына пыласосам біла рабаўніка амаль да прыезду паліцыі.

ЗДЗІВІЛА ГРАМАДСКАСЦЬ

Стагадовая брытанка Дорыс Эйлінг з горада Фэрхем атрымала ліст з гарадской бальніцы, які паведамляў жанчыне аб... цяжарнасці. Састарэлую пацыентку інфармавалі пра неабходнасць прыйсці на агляд і здаць адпаведныя аналізы.

Як расказала Эйлінг, пасля чытання дакумента яна адразу адчула нядобрае, нягледзячы на тое, што яе імя і дата нараджэння былі ўказаны гінекалагамі правільна. «У мяне трое дзяцей і дваццаць унукаў, і я не была цяжарнай ужо гадоў 70», — сказала жанчына. Звязаўшыся з бальніцай, Эйлінг і яе сваякі высветлілі, што адбылася памылка. Пажылой пацыентцы і яе сям'і прынеслі прабачэнні за «турботы, якія мог выклікаць ліст». Як распавёў 76-гадовы сын жанчыны, яго маці як след пасмяялася, калі непаразуменне вырашылася. Згодна з Кнігай рэкордаў Гінэса, самай пажылой у свеце жанчынай, якая зачала натуральным спосабам і нарадзіла дзіця, з'яўляецца 59-гадовая брытанка Дон Брук.

Іван КУПАРВАС.

НЯДЗЕЛЯ, 9 ЖНІЎНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

5.50 Меладрама «Незабудкі».
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 «Арсенал».
9.40, 0.35 Серыял «Байкі Міцяя».
10.45 «50 рэцэптаў першага».
11.25 XXL WOMAN TV.
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
12.35 Зона Х. Вынікі тыдня.
13.05 Дак. фільм.
13.40 Каробка перадач.
14.15 Вакол планеты.
15.15 Твой горад.
15.30 Нашы.
15.45 Меладрама «Была табе каханая». 3—4-я серыі.
17.35 Меладрама «Ты заплаціш за ўсё».
21.00 Галоўны эфір.
21.55 Клуб рэдактараў.
22.30 Навіны надвор'я.
22.55 Меладрама «Куды знікае каханне».

БЕЛАРУСЬ 2

7.05 М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
8.45, 21.45 Серыял «Шчаслівыя разам».
10.25 Я хачу гэта ўбачыць!
11.05 Хачу ў тэлевізар!
11.15, 20.05 Тэлебарометр.
11.20 Ваша лато.
11.50 Латарэя «Пяцёрачка».
12.00 Серыял «Мая цудоўная нянька».
14.00 Камедыя «Клік: з пультам па жыцці».
15.55 Фантастыка «Драпежнік-2».
17.55 «Comedy woman».
19.15 Суперлато.
20.40 Кіпень.
21.00 Рэальны свет.
21.40 Спортлато 5 з 36, КЕНО.
23.25 Трагікамедыя «Маленькая міс Шчасце».

БЕЛАРУСЬ 3

7.50, 12.20, 16.50, 0.55 «Калейдаскоп».
8.00 «Тайны палацавых пераваротаў». Драма. «Я — імператар».
9.15 «Тайны палацавых пераваротаў». Драма. «Падзенне Галіяфа».
10.35 «Наперад у мінулае».
11.00, 21.00 Хіт-парад. «Сто песень для Беларусі».
11.55 «Азёрная Адысея». Возера Свір, возера Вішнеўскае.
12.30, 21.55 «Леапард». Драма.

15.30 «Панцеляймон Панамарэнка». Дак. фільм.
16.20 «Грані Перамогі». Песні Перамогі.
17.00 «Мелодыі белай ночы». Меладрама.
18.30 «Музеі Беларусі». Музей кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь.
19.00 «Дзень добры, сталіца!» Меладрама.
20.45 «Калыханка».

БЕЛАРУСЬ 5

6.50, 2.00 PRO спорт. Навіны.
7.05 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Першы тур. «Манчэстэр Юнайтэд» — «Тотэнхэм».
8.55 Тэніс. Турнір ВТА. Стэнфард. Паўфінал.
11.00 Пляжны валейбол. Турнір серыі «Мастэрс». Мужчыны. Паўфіналы.
13.00 Мастацкая гімнастыка. Кубак свету. Будапешт.
15.25 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Арсенал» — «Вест Хэм».
17.25 Чэмпіянат свету па водных відах спорту. Плаванне.
20.25 Валейбол. Еўраліга. Мужчыны. Беларусь — Турцыя.
22.25 Пляжны валейбол. Турнір серыі «Мастэрс». Мужчыны. Жанчыны. Фіналы.
0.15 Тэніс. Турнір ВТА. Стэнфард. Фінал.

АНТ

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00, 16.00 Нашы навіны.
9.05 «Нядзельная пропаведзь» (з субцітрамі).
9.20 М/с «Смяшарыкі. ПІНкод».
9.35 «Бесталковыя нататкі».
9.55 «Пакуль усе дома».
10.40 «Фазэнда».
11.15 «Ідэальны рамонт».
12.25 Камедыя «З'яўляецца Данстан».
14.05 Серыял «Тата напракат».
16.15 Навіны спорту.
16.20 «Алег Папоў. «Я жывы!».
17.30 «Музычны фестываль «Голосящий КиВиН».
20.00 Контуры.
21.05 «Аффтар жжот».
22.10 Баявік «Перавозчык-2».
23.45 Маст. фільм «Разбураны палац».

СТБ

6.15 «Афрамасквіч». Серыял.
7.05 «Скардзіцца дазваляецца».
7.25 «Аўтапанарама».
7.50 Драма «Доўгія заручыны».
10.05 «Чыстая праца».
11.00 «Вялікае снеданне».
11.40 «Салдаты-4». Серыял.

13.30, 16.30 «24 гадзіны».
13.45, 23.50 Дэтэктыў «Увага! Усім пастам...».
15.15 «Дарагая перадача».
16.00 «Цэнтральны рэгіён».
16.50 «Дакументальны праект»: «Прыстанак розуму».
17.45 «Ваенная тайна».
19.30 «Тыдзень».
20.25 Маст. фільм «Бывай, Парыж».
22.10 «Званая вячэра». Самыя яркія тыдні.
1.10 «Масква. Дзень і ноч».

МІР

6.00 М/ф.
8.15 Маст. фільм «Куфар Марыі Медычы».
10.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
10.15 «Чаму я?».
10.45 Серыял «Кароткае дыханне».
14.15 Маст. фільм «Прадчуванне».
16.15 Серыял «Праклятыя каралі».
21.00 Маст. фільм «Дамавік».
23.05 Маст. фільм «Прыгажунчык Джо».
0.55 Маст. фільм «Пернікі з бульбы».
2.40 Серыял «Адчыніце, гэта я!»

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Ха». Маленькія камедыі.
7.35 Маст. фільм «Правінцыялка».
11.00, 14.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Сам сабе рэжысёр».
12.20 «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
12.50 «Ранішняя пошта».
13.30 М/ф.
14.15 «Кулінарная зорка».
15.10 Маст. фільм «Бландзінка за вуглом».
16.45 Маст. фільм «Загадана жаніць».
18.40, 21.00 Маст. фільм «Паласа адчужэння».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.10, 8.20 Серыял «Пляж».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00 Сёння.
8.55 «Добра там, дзе мы ёсць!»
9.20 «Ядзім дома».
10.25 «Галоўная дарога».
10.50 «ГМА. Ежа разладу».
11.55 «Дачны адказ».
13.20 «Справа цёмная».
14.15, 16.20 Серыял «Псеўданім «Албанец».
18.05 «Следства вялі».
19.00 «Акцэнты».
19.35 «Чыстасардэчнае прызнанне».
20.20 Маст. фільм «Белы чалавек».
23.45 «Жыццё як песня. Нямара».
0.35 Серыял «Горад спакус».

8 КАНАЛ

9.00, 15.35, 18.55, 21.05 «Надвор'е».
9.05, 15.40 Мультпарад.
10.00 «Адшукваецца адпачынак».
10.30, 13.20, 16.55, 21.00 «Хатняя крама».
10.45, 23.20 «Хобі TV».
11.35 Баявік «Абрабаванне па-італьянску».
13.30 Трылер «Дэжа вю».
17.25 Серыял «Каломба».
18.45 «Неверагодная магія».
19.00 Камедыя «Новы хлопец маёй мамы».
20.45 «Вечарніца».
21.10 Трылер «Найміты».

ВТВ

6.00 «PLAY».
8.00 «Ералаш».
9.00 Серыял «Супер Макс».
10.00, 1.00 «Турбаміксер».
12.00 Серыял «Два бацькі і два сыны».
13.30 «Паспець за 24 гадзіны».
14.30 «Рублёва—Бірулёва».
15.30 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
16.00, 4.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
16.45 Прыгоды «Падарожжы на Кон-Цікі».
19.00 «Уральскія пельмені».
20.30 Фантастыка «Паралельныя светы».
22.45 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
23.30 «Без вежы».
0.30, 4.00 «Лаві момант».
3.30 Скетч-шоу «Валера-ТБ».
5.00 Серыял «Тарыф на мінулае».

КУЛЬТУРА

6.30 «Еўраньюс».
10.00 «Звычайны канцэрт».
10.35 «У пагоні за славай». Маст. фільм.
12.00 «Легенды сусветнага кіно». Серафіма Бірман.
12.25 «Клімат. Апошні прагноз». Дак. фільм.
12.55 Геніі і ліхадзеі. Уладзімір Даль.
13.25 «Севастопальскія апавяданні. Падарожжа ў гісторыю з Ігарам Залатавіцкім». Дак. серыял.
14.10 Краіна птушак. «Пустэльнікі ракі Пры». Дак. фільм.
14.50 85 гадоў з дня нараджэння Юрыя Гуляева. «Незабыўныя галасы».
15.30 «Пешшу...» Масква літаратурная.
16.00 «Дынастыя без грыму».
16.50 Сяргей Міхалкоў. «Дзядзька Сцёпа». Вершы для дзяцей.
17.25 «Тайна белага ўцекача». Дак. фільм.
18.15, 1.55 «Шукальнікі». «Завяшчанне Сцелецкага».
19.00 70 гадоў Валерыю Ахадаву. «Руфь». Маст. фільм.
20.25 Вера Васільева. Творчы вечар у тэатры Сатыры.
22.00 З калекцыі тэлеканала «Культура». Вялікая опера-2014.
23.25 «Крэйцарава саната». Маст. фільм.
2.40 «Сусветныя скарбы культуры».

НАСТАЛЬГІЯ

6.00, 12.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1973. Паўтор ад 2010 года.
7.25 Маст. фільм «Горад з раніцы да паўночы».
9.00, 3.00 «Мінулы час».
9.40, 11.10, 17.20, 18.40, 20.15, 20.55, 23.30, 3.40, 4.55 Музычная настальгія.
10.00 Юбілейны канцэрт групы «Земляне». 1-е аддзяленне. 2008 год.
13.20 «АукцЫон: як чуецца, так і пішацца». 2007 год.
14.40 М/с «Болек і Лёлек».
15.00 «Быў час». 2009 год.
16.00 Маст. фільм «Асабліва небяспечныя».
18.00 «Акулы пяра». Таццяна Буланава. 1996 год.
19.20 «Трыбунал». Канцэрт Наталлі Мядзведзевай. 1995 год.
20.40 М/с «Болек і Лёлек на канікулах».
22.00 Маст. фільм «Кароткія сустрэчы».
1.10 Маст. фільм «Белы выбух».
2.40 М/ф «У лясным гушчары».
4.00 «Народжаныя ў СССР». Лепшае.
5.20 «Рок-н-рол ТБ». «Фестываль Робін Гуд» у г. Лыткарына. 1993 год.

EUROSPORT

3.00, 7.15, 9.15, 16.15, 22.00, 1.00 Плаванне. Чэмпіянат свету.
4.00 WATTS.
4.15, 13.00 Веславанне. Слалам. Кубак свету.
5.15, 21.00 Веласпорт. Тур Польшчы.
6.15, 15.00, 20.15 Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры.
12.00 Воднае пола. Чэмпіянат свету. Фінал.
14.00 Настольны тэніс. Фіналы.
23.00 Футбол. Старэйшая ліга футбола. «Лос-Анджэлес Гэлаксі» (ЗША) — «Seattle Sounders FC» (ЗША).
2.00 Футбол. Старэйшая ліга футбола. «Нью-Ёрк Рэд Булз» (ЗША) — «New York City FC» (ЗША).

КАМЕДЫЯ

6.00, 9.50, 3.10 Серыял «Былыя».
6.45 Меладрама «Па прыкметах сумяшчальнасці».
8.20 Камедыя «Дублёр».
10.15, 17.40, 22.00 Серыял «Прападобны».
10.45 Камедыя «Маё вялікае грэчаскае лета».
12.30 Камедыя «Чалавек-эльф».
14.00, 0.55, 2.55, 5.40 Скетч-ком «Паміж намі».
14.20 Камедыя «Нешта падобнае на шчасце».
16.00 Камедыя «Выкрутасы».
18.45 Камедыя «Касцюм Санты».
20.20 Камедыя «Зноў у гульні».
22.35 Серыял «Нумар адзін спадар Кхан». 1-я серыя.
23.10 Камедыя «Як страціць сяброў і прымусіць усіх цябе ненавідзець».
1.15 Камедыя «Ад 180 і вышэй».
4.00 Камедыя «Шосты элемент».

ТБ3

6.00 М/ф.
9.35, 5.15 «Нераскрытыя тайны».
10.30 «Паненка і кулінар».
11.05, 1.50 Серыял «Каменская».
15.00 «Сто пытанняў даросламу».
15.50 «Жонка. Гісторыя кахання».
17.10 «Без падману».
18.00 «Код жыцця». Дак. фільм.
19.45 «Доказ віны».
20.40 Маст. фільм «Чорная архідэя».
22.55 «Асцярожна, махляры!».
23.25 «Часова даступны».
0.20 «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

ТБ1000

6.45 Драма «Прысуд».
8.35 Драма «Прынцэса Манака».
10.20, 2.10 Драма «У пагоні за шчасцем».
12.20 Прыгоды «Лекар: вучань Авіцэны».
15.00 Трылер «Сотавы».
16.40 Драма «Разня».
18.10 Камедыя «1+1».
20.00 Фэнтэзі «Гары Потэр і вязень Азкабана».
22.30 Камедыя «Як страціць сяброў і прымусіць усіх цябе ненавідзець».
0.30 Трылер «Жанчына ў чорным».
4.20 Меладрама «Па прыкметах сумяшчальнасці».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Камедыя «Саламяны капялюшык».
8.50 Прыгоды «Прыватнае піянерскае».
10.40 Драма «Захоўвай мяне, мой талісман».
12.00 Камедыя «Пра што маўчаць дзяўчаты».
13.30 Трылер «Асабісты нумар».
15.20 Баявік «Дзень Д.»
16.50 Меладрама «Вы не пакінеце мяне».
18.50 Камедыя «Змяшаныя пачуцці».
20.20 Містыка «Вій».
22.25 Драма «Неба паўшых».
0.25 Драма «Weekend».
2.00 Драма «Дом з вежкай».
3.20 Драма «Балада пра бамбера».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00 Скарбашукальнікі.
6.50, 8.05 Навуковыя недарэчнасці.
7.15 Зрабі або памры.
8.30 Тайвань: вастраў рыбы — Вялікі ўлоў.
9.20 Калі кракадзілы елі дыназаўраў.
10.10 Найбуйнейшыя жывёлы усіх часоў.
11.00 Гульні розуму.
11.20, 18.30 Гульня ў лікі.
11.50 Космас: Прастора і час.
12.40, 17.40, 20.10, 23.30, 2.50, 5.15 Мегазаводы.
13.30 Вялікія рэйды Другой сусветнай вайны.
14.20 Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
15.10 Адзін акіян.
16.00 Народжаны поўзаць — лётаць можа!
16.50 Кітай з вышыні птушынага палёту.
19.20 Кіраванне натоўпам.
21.00, 0.20, 3.40 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала.
21.50, 1.10, 4.30 80-я: дзесяцігоддзе, якое стварыла нас.
22.40, 2.00, 5.20 Суперзбудаванні.

DISCOVERY

8.00 Гаражнае золата.
8.50, 1.30 Што ў вас у гаражы?
9.40 Бітвы за кантэйнеры.
10.30, 4.00 Сківіцы, якія лётаюць.
11.20 Інжынерыя немагчымага.
12.10 Аляска: сям'я з лесу.
13.00, 3.10 Выжыць разам.
13.50 Акварыумны бізнес.
14.40 Майстар па стварэнні басейнаў.
15.30, 22.10 Катастрофа на колах.
16.20, 18.00, 23.00, 5.35 Гіганцкія мячы.
17.10, 23.50 Зараз ірване.
20.30 Ледзяное золата.
21.20 Дарожныя каўбоі.
0.40 Поўны фарсаж.
2.20 Смяротны ўлоў.
4.50 Як гэта ўстроена?
5.10 Як гэта зроблена?

■ Паедзем адпачнем

БУДЗЬ ПІЛЬНЫМ, ТУРЫСТ!

Што будзе першым у чамадане адпускніка, які збіраецца за межы радзімы? Правільна, аптэчка першай дапамогі. Гэта, пагадзіцеся, сэканоміць час на пошук лекаў у чужой краіне, дый пазбавіць праблемных кантактаў на замежнай мове. Паверце, што работнікі аптэк у Мантэнегра не разумеюць слова «пластыр». Выручае, вядома, прамое паказванне пальцам на тое, што вам трэба, але далей ужо — што дадуць (пажаданні адносна памеру, колеру і г.д. адпадаюць). Так што сёе-тое трэба прыхапіць, хоць гэта і не вызваляе нас ад вытрымлівання пэўных правілаў пражывання, харчавання і культурнага адпачынку.

Людзі з краін умеранага клімату маюць патрэбу ў адаптацыі ў краінах трапічных і субтрапічных. Каб не дапусціць сонечнага і цеплавога ўдару, неабходна насіць адзенне з лёгкіх і натуральных тканін, летні галаўны ўбор, змазваць адкрытыя ўчасткі скуры крэмам ад загару, больш піць вады і менш — алкаголю.

Заўсёды будзьце асцярожнымі з мясцовымі кошкамі, сабакамі і іншымі жывёламі. Гэта небяспечна практычна ва ўсіх краінах. Калі атрымалі ўкус, драпіны, або проста на скуру трапіла сліна жывёлы, дасканала прамыйце гэту частку цела вадой з мылам, а пасля тут жа звярніцеся да ўрача для вырашэння пытання аб правядзенні прышчэпак супраць шаленства і слупняку. Асцерагайцеся таксама ядавітых змей, скарпіёнаў, каракуртаў, тарантулаў, ядавітых медуз, п'явак, рыб, а таксама блох, кляшчоў, камароў, сляпнёў, мошак і мух, якія могуць быць пераносчыкамі трапічных інфекцыйных і паразітарных захворванняў. Заўважылі ўкусы, высыпкі — пакажыцеся ўрачу.

У незнаёмых і малазнаёмых краінах бяспечным пражыванне лічыцца толькі ў гасцініцах, дзе ёсць цэнтралізаванае водазабеспячэнне і каналізацыя. Пры наяўнасці ў нумары насякомых ці грызуноў, вядома, трэба апавясціць аб гэтым адміністрацыю. Пры вялікай колькасці лятаючых насякомых патрабуйце закрыць сеткамі вокны і дзверы, выдаць электрафумігатар. Набывайце пры неабходнасці рэпеленты і інсектыцыды для адпужвання насякомых.

З харчаваннем усё даволі проста, хоць практыка паказвае, што далёка не ўсе прыслухоўваюцца да голасу розуму. Першае правіла — ужываць тую і толькі тую ежу, у якасці якой вы ўпэўнены. Набывайце ежу там, дзе, на вашу думку, мінімальная рызыка набыцця прадуктаў дрэннай якасці. Не эксперыментуйце з вадой — піце бутыляваную і гатаваную, а напоі і сокі — толькі прамысловай вытворчасці. Нельга ўжываць лёд з сырой вады, а паколькі вы наўрад ці зможаце дакладна ўстанавіць, што там у лёдзе за вада, то проста адмаўляйцеся ад яго ўжывання. Гародніну і садавіну таксама неабходна мыць бяспечнай вадой (гатаванай або бутыляванай), абдаваць кіпенем. Ужывайце толькі вельмі добра прасмажаныя, правараныя мяса, рыбу, морапрадукты, а без тэрмічнай апрацоўкі не ешце такія прадукты ўвогуле.

Перш чым наведаць нейкую кавярню, бар, рэстаран, парайцеся з прадстаўніком турфірмы адносна іх рэпутацыі. Не рэкамендуецца, вядома, набываць ежу на рынках, з латкоў, каштаваць тое, што гатуе мясцовае насельніцтва. Гарантаваць якасць і бяспеку можа толькі фабрычная ўпакоўка, а такі тавар прадаецца ў прадуктовых магазінах. Але і тут звяртайце ўвагу на тэрмін прыдатнасці, захаванне тэмпературнага рэжыму.

Большасць краін Азіяцкага, Афрыканскага і Паўднёва-Амерыканскага кантынентаў неспрыяльныя па захваральнасці на гепатыт А. Але для прафілактыкі гэтага захворвання прадугледжана вакцынацыя. Абарончы эфект вакцыны праяўляецца ўжо з канца першага тыдня пасля прышчэпкі, адна доза абараняе на 1-1,5 года.

Кішэчныя інфекцыі (брушны тыф, дызентэрыя, сальманелёз, ротавірусныя інфекцыі, гепатыт А, энтэравірусныя інфекцыі і інш.) шырока распаўсюджаны ва ўсіх краінах свету. Механізм заражэння — фекальна-аральны (таму гігіена і яшчэ раз гігіена!). Часты вадкі стул, ваніты, павышэнне тэмпературы цела, боль у жываце, моцны галаўны боль, боль у горле, мышцах, сып на целе павінны насцярожыць і тэрмінова накіраваць да ўрача. Хворага лепей ізаляваць і выдзеліць яму асобны посуд.

Святлана БАРЫСЕНКА.

protas@zviazda.by

■ Неасабісты суб'ектыў

ПРЭЙСКУРАНТ ПАСЛУГ

Пра законы рынку, пракіслыя парэчкі і шпалеры пад ганкам

У нашым парэчкавым краі ўраджай сёлета не такі вялікі, як летась. Больш урадзіла смародзіна — менавіта так у нас завуцца парэчкі чорныя. Пэўна, першы куст прывезлі людзі рускамоўныя (а іх у нашай вёсцы ў 20-я — 30-я гады мінулага стагоддзя хапала, бо стаяла пагранічная застава на колішнім памежжы з Польшчай, і служылі на ёй у асноўным ураджэнцы Курскай і Разанскай абласцей). Чорныя вітамінныя ягады і сёння маюць статус далікатэсу, прынамсі, вырошчваюцца толькі для ўласнага карыстання: перакручаныя з цукрам на мясарубку, яны могуць стаяць у халадзільніку да наступнага года. Смаката! А вось родныя парэчкі (менавіта чырвоныя) у нас на вытворчы паток пастаўлены. У кожным двары кустоў па пятнаццаць, а то і больш, і кіслыя ягады кожнае лета даюць добры прыбытак. Ва ўсякім разе, на цукар, каб з астатняга садовага ды ляснога ўраджаю зварыць варэнне і паставіць кампоты, хапае.

Раней здача гэтых самых парэчак ператваралася ў сапраўдную эпапею для дарослых і цікавую прыгоду для дзяцей. Нарыхтоўчы пункт знаходзіўся ў суседняй вёсцы, таму везці ягады даводзілася на падводах. Тут у выйгрышы былі тыя, хто працаваў у саўгасе: у іх коні былі ў руках, астатнія ж дзейнічалі па прынцыпе «з кім дамовішся». Нярэдка на адну падводу нагружалі столькі вываракаў, вёдраў і мяхоў з-пад мінеральных угнаенняў, што сесці ўжо не было дзе нават таму, хто за лейцамі. Прыехаўшы, стаялі ў даўжэзнай чарзе з гэткіх самых падвод, што з'язджаліся з усяго навакольля. Прымалі ягады павольна: узважвалі кожную ёмістасць на вагах з гірамі, адымалі вагу посуду, вылічвалі зніжку за лісце, занатоўвалі ўсё ў сшытак з цыратовай вокладкай (разлік праводзілі праз колькі дзён).

Прастаяць у той чарзе можна было да вечара. Але гэта яшчэ паўбяды — горш за ўсё было, калі ў нарыхтоўшчыцы заканчвалася тара — вялізныя пластыкавыя бочкі. Тады, не зважаючы на ўмольныя просьбы, яна зачыняла дзверы прыёмнага пункта проста перад носам у людзей. Тыя, каму не пашанцавала, выказаўшы абурэнне, раптам успаміналі, што ў вёсцы за чатыры кіламетры ёсць яшчэ адзін прыёмны пункт, і кідаліся туды. Вось гэта было весела! Коней гналі адно перад адным ледзь не галопам, вываркі бразгалі, кабеты вішчалі на падводах ад страху, дзеці — ад захаплення, колы на незаасфальтаванай дарозе ўздымалі клубы белага пылу, і парэчкі станавіліся, нібы прысыпаныя цукровай пудрай. Праўда, нярэдка гэтыя гонкі не мелі выніку: на прыёмным пункце маглі чакаць замкнутыя на цяжкі замок дзверы і надрапанае на шматку паперы «Няма тары» (не тое што сотавыя — звычайныя тэлефоны былі на вёсцы гадоў трыццаць таму вялікай рэдкасцю, таму даведацца пра гэта папарадзе было проста немагчыма).

Хтосьці, у каго ягады былі зеленаватыя, ехаў ні з чым дадому, спадзеючыся, што заўтра пашанцуе больш, хтосьці, у каго спелыя парэчкі пасля гонак па гарачыні патаўкліся, пусцілі сок і нават паспелі забрадзіць, праклінаючы ўсё на свеце, ссыпаў не здадзены і ўжо ні на што не прыдатны ўраджай проста на ўзбочыне дарогі. Здаралася, такімі вось рудымі гнілымі кучамі былі засыпаны ўсе ўзбочыны. Але налета ўсё паўтаралася зноў: млоснае сядзенне ў кустах пад гарачым сонцам і гудзеннем аваднёў, пошук падводы, стаянне ў доўгай чарзе. Бо калі шанцавала, можна было за здадзенае купіць дзіцяці поўную экіпіроўку да школы, напрыклад. І нам тады гэта было патрэбна больш, чым нарыхтоўшчыкам, у якіх план (а з ім — і прэмія) залежаў выключна ад напоўненасці бочак, што былі на той момант у наяўнасці...

Пра ўсё гэта мы нядаўна з лёгкім адценнем настальгіі па вясковым вольным дзяцінстве ўспаміналі з сястрой, пільнуючы каля брамкі перасоўны нарыхтоўчы пункт, які павольна праехаў па вёсцы, сігналячы, каб на зваротным шляху сабраць тое, што людзі за апошнія два дні паспелі назбіраць. Цяпер у тых, хто хоча парэчкі здаць, толькі адзін клопат: сёлета з-за халоднай вясны гронкі не такія доўгія ды ягады не такія буйныя. Ды яшчэ машыну, што збірае, не праваронiць.

Зрэшты, за апошняе людзі асабліва і не хвалююцца: прапусціш гэту — будзе іншая. Нарыхтоўшчыкі з'язджаюцца да нас, без перабольшвання, з усёй краіны. Той, якога чакалі мы, прыпісаны да Жлобіна (адтуль да нашай вёскі кіламетраў, пэўна, трыста). Хуценька ўскінуў на электронную вагу нашу вываркі, падлічыў на калькулятары, аддаў грошы (сто адзінаццаць тысяч — як з куста, за пару гадзін), паехаў далей. Усім добра, усе задаволеныя. Законы рынку і новага, больш імклівага стагоддзя: твая справа будзе паспяховай толькі тады, калі яе вынікі будуць зручнымі і выгаднымі для спажыўцоў. Інакш на тваё месца вельмі хутка прыйдуць іншыя, якія прапануюць спажыўцу тое, што ён хоча, а ты застанешся ні з чым. Вельмі нават правільна і справядліва.

Не ўсе, праўда, пакуль гэта разумеюць. Давялося нядаўна рабіць рамонт на кухні. У будаўнічым супермаркеце ў сваім мікрараёне купіла ўсё, што трэба было, адным заходам. І з дастаўкай праблем, здавалася, не будзе: па Мінску яна ў магазіна бясплатная. «Але толькі да пад'езда»,— папярэдзіла ветлівая дзяўчына, якая выпісвала накладную. Фактычна паставіўшы перад фактам, бо ва ўсіх аб'явах аб дастаўцы пра гэта — ні слова. «Як жа так? — разгублена залыпала я вачыма, уяўляючы, як цягну на ганак і да ліфта мяшкі з тынкоўкай і скрынкі з пліткай. — Я гатова даплаціць, колькі скажаце, абы паднялі ў кватэру». «Ну, не ведаю, можа, на месцы дамовіцеся...»

Адступаць не было куды, за матэрыялы ўжо былі заплочаны немалыя грошы. З грузчыкамі, што прывезлі пакупку, дамовіцца не ўдалося: хлопцы, спачуваючы беднай жанчыне, падняць мяшкі і скрынкі хаця б да ліфта (вядома ж, не бясплатна!) не пагадзіліся ні за што. Сказалі: іх за гэта звальняюць без папярэджання.

Не буду расказваць пра тое, як дошкі, тынкоўка і плітка трапілі тады на мой сёмы паверх. Пасля я папрасіла ў магазіне кнігу заўваг і прапаноў і напісала... не, не скаргу і нават не заўвагу — менавіта прапанову. Маўляў, шаноўныя, калі хочаце не прайграць у канкурэнцыі з іншымі, зрабіце папраўчку ў дастаўцы. Зрабіце яе платнай, напрыклад. Ці за дастаўку ад пад'езда ў кватэру ўстанавіце таксу. Без розніцы, але каб было па-людску.

Сёлета я пакой узялася рамантаваць. Першае, што зрабіла, — патэлефанавала ў той супермаркет, пацікавілася пра ўмовы дастаўкі. Усё тое ж — да пад'езда бясплатна, а там хоць ты танцуй на выкінутых пад ганкам шпалерах ды паркеце...

Карацей, як мінімум, на аднаго пакупніка ў іх дакладна стала менш. Законы рынку жорсткія, але справядлівыя.

Алена ЛЯЎКОВІЧ. *alena@zviazda.by*

■ Інфарм-укол

РУКІ!.. МЫЛІ?

Успышак кішэчных інфекцый, звязаных з парушэннямі нормаў вытворчасці і захоўвання прадуктаў, сёлета ў нас не зарэгістравана, аднак цалкам пазбавіцца вострых кішэчных захворванняў, безумоўна, немагчыма.

— У апошнія гады ўдалося стабілізаваць паказчыкі вострай кішэчнай інфекцыі, — кажа **загадчык супрацьэпідэмічнага аддзялення Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Дзмітрый ГАЛОЦІК.** — У нас няма ўспышак (а ўспышка — гэта інфіцыраванне, сама меней дзесяці чалавек), звязаных з ужываннем той жа малочнай прадукцыі. Але ёсць сямейныя выпадкі захваральнасці, калі першымі інфіцыруюцца дзеці, а ад іх — і бацькі. Самае важнае ў гэтым выпадку — вытрымліванне элементарных правілаў гігіены! Часцей трэба мыць рукі, пільней сачыць за тым, што і як мы ўжываем...

Гігіенічныя патрабаванні, праўда, павінны вытрымліваць і гандлёвыя аб'екты, але 93 працэнты з абследаваных санэпідслужбай у першым паўгоддзі патрабаванні ігнаруюць. Спажыўцы пры гэтым не пацярпелі, але маглі б. Вось звычайныя парушэнні, на якія не толькі спецыялісты, але і кожны з нас павінен звяртаць увагу:

• нездавальняючы санітарны стан тэрыторыі, памяшканняў, абсталявання;

• неналежныя ўмовы захавання;

• рэалізацыя пратэрмінаванага тавару;

• адсутнасць дакументаў, якія пацвярджаюць якасць і бяспеку.

Пра такія парушэнні варта паведамляць работнікам гандлю або санэпіднагляду.

Як папярэдзіць захворванні, звязаныя з ужываннем ежы?

Хоць большасць мікраарганізмаў не выклікае ніякіх захворванняў, усё ж такі ёсць і небяспечныя, якія сустракаюцца ў глебе, вадзе, арганізме жывёл і чалавека. Перадаюцца гэтыя мікробы праз поціск рукі, гаспадарчыя анучы, апрацоўчыя дошкі. Звычайны дотык здольны перанесці іх у прадукты і выклікаць харчовае захворванне.

Аддзяляйце сырыя і гатовыя да ўжывання прадукты:

• пры перавозцы асобна складзіце прыгатаванае і тое, што патрабуе гатавання;

Ратавальная таблетка

На выпадак «лёгкіх» атручэнняў майце ў хатняй аптэчцы ніфураксазід, цыпрафлаксацын, а таксама энтэрасарбенты кшталту смекты і актываванага вуглю. Падчас дыярэі неабходна таксама спажываць вялікую колькасць вады. Можна прымяняць і салявыя сумесі, якія ў сухім выглядзе прадаюцца ў аптэках (нормагідрон у парашку).

• мяса, у тым ліку мяса птушкі, а таксама морапрадукты заўсёды захоўвайце асобна ад усіх іншых прадуктаў;

• захоўвайце прадукты ў закрытай тары;

• карыстайцеся асобнымі апрацоўчымі дошкамі і нажамі для сырой і прыгатаванай прадукцыі.

У сырых прадуктах, мясе, птушцы і марскіх прадуктах могуць быць небяспечныя мікраарганізмы, якія можна перанесці падчас прыгатавання і захоўвання ў іншыя прадукты.

Вытрымлівайце тэхналогію гатавання страў:

*дасканала смажце і варыце, асабліва мяса, птушку, яйкі (не ешце іх сырымі!) і морапрадукты;

• сок мяса або птушкі павінен быць па завяршэнні гатавання празрыстым;

• дасканала прагравайце стравы — суп кіпяціце, смажанае трымайце на агні не менш за 5 хвілін.

Падчас дасканалай цеплавой апрацоўкі гінуць практычна ўсе небяспечныя мікраарганізмы. Даследаванне паказвае, што цеплавая апрацоўка прадуктаў пры тэмпературы 70 градусаў можа зрабіць іх значна больш бяспечнымі. Асаблівую ўвагу неабходна звяртаць на мясны фарш, мясныя рулеты, вялікія кавалкі мяса і тушкі птушкі.

Святлана БАРЫСЕНКА.

protas@zviazda.by

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	- Капитальное строение инв. № 400/С-69051 (назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель), площадью 220,4 кв.м, г.Гродно, ул. Максима Горького, 121К/2. - Капитальное строение инв. № 400/С-69021 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), площадью 243,9 кв.м, г.Гродно, ул. Максима Горького, 121К/1. - Капитальное строение инв. № 400/С-69106 (назначение – здание многофункциональное), площадью 1209,3 кв.м, г.Гродно, ул. Максима Горького, 121К. - Капитальное строение инв. № 400/С-97342 (назначение – сооружение неустановленного назначения), площадью 2070,0 кв.м, г.Гродно, ул. Максима Горького, 121, благоустройство территории для обслуживания зданий столярной мастерской, блока складов и механического цеха, склада КиПа. - Капитальное строение инв. № 400/С-97348 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства), протяженностью 68,6 м, г.Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная фекальная канализационная сеть к зданию блока складов и механического цеха. - Капитальное строение инв. № 400/С-97337 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства), протяженностью 81,3 м, г.Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная ливневая канализационная сеть к блоку складов. - Капитальное строение инв. № 400/С-97332 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства), протяженностью 104,5 м, г.Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод к блоку складов и механическому цеху. - Капитальное строение инв. № 400/С-97387 (назначение – сооружение специализированное энергетики), протяженностью 228,7 м, г.Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная кабельная линия 10 кВ от РП-10кВ до ТП-3 до ТП-4. - Капитальное строение инв. № 400/С-97379 (назначение – сооружение специализированное энергетики), протяженностью 61,25 м, г.Гродно, ул. Максима Горького, 121, электрическая сеть 0,4 кВ к блоку складов и механическому цеху. - Капитальное строение инв. № 400/С-85886 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства), протяженностью 343,9 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; - шкаф распределительный ПР-24-7208; - трансформаторная подстанция 2 РТ 1000/10 № 1; - распределительный пункт ПР-24-11-7205; - трансформатор масляный силовой ДУ-ТМЗ-1000/10 ТП-2; - трансформатор масляный силовой ДУ-ТМЗ-1000/10 ТП-2; - распределительный пункт ПР-24-7210-54УЗ; - теплосчетчик ТЭМ 05м, ДУ=80; - теплосчетчик ТС-07ХХ-88 «Струмень»; - туя (1 единица).
Земельный участок, на котором расположен объект	- кадастровый номер 440100000002008242, площадью 0,9480 га (назначение – для обслуживания зданий столярной мастерской (инвентарный номер 400/С-69051), блока складов и механического цеха (инвентарный номер 400/С-69106), склада КиПа (инвентарный номер 400/С-69021)) по адресу: г.Гродно, ул. Максима Горького, 121 К; - кадастровый номер 440100000002006868, площадью 0,0007 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети) по адресу: г.Гродно, ул. Максима Горького, 121; - кадастровый номер 440100000002006869, площадью 0,0007 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети) по адресу: г.Гродно, ул. Максима Горького, 121; - кадастровый номер 440100000002006871, площадью 0,0003 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети) по адресу: г.Гродно, ул. Максима Горького, 121; - кадастровый номер 440100000002006872, площадью 0,0002 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети) по адресу: г.Гродно, ул. Максима Горького, 121; - кадастровый номер 440100000002006873, площадью 0,0002 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети) по адресу: г.Гродно, ул. Максима Горького, 121; - кадастровый номер 440100000002006874, площадью 0,0003 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети) по адресу: г.Гродно, ул. Максима Горького, 121; - кадастровый номер 440100000002006875, площадью 0,0037 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети) по адресу: г.Гродно, ул. Максима Горького, 121; - кадастровый номер 440100000002006876, площадью 0,0002 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети) по адресу: г.Гродно, ул. Максима Горького, 121; - кадастровый номер 440100000002006877, площадью 0,0003 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети) по адресу: г.Гродно, ул. Максима Горького, 121; - кадастровый номер 440100000002006878, площадью 0,0003 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети) по адресу: г.Гродно, ул. Максима Горького, 121; - кадастровый номер 440100000002006879, площадью 0,0312 га (назначение – земельный участок для обслуживания внеплощадочной тепловой сети) по адресу: г.Гродно, ул. Максима Горького, 121
Начальная цена продажи	6 110 325 481 (шесть миллиардов сто десять миллионов триста двадцать пять тысяч четыреста восемьдесят один) белорусский рубль без учета НДС
Сумма задатка	305 516 274 (триста пять миллионов пятьсот шестнадцать тысяч двести семьдесят четыре) белорусских рубля
Условия аукциона	Без условий
ЛОТ 2	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	- Капитальное строение инв. № 400/С-89984 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование — ангар), площадью 449,7 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Ж; - Капитальное строение инв. № 400/С-69050 (назначение – здание специализированное трубопроводного транспорта, наименование – насосная станция), площадью 187,6 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Ж/1; - Капитальное строение инв. № 400/С-97340 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство территории), площадью 105,0 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, благоустройство территории для обслуживания здания автоматической насосной станции, резервуара для воды и здания ангара; - Капитальное строение инв. № 400/С-58952 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – резервуар для воды на 500 куб.м), объемом 500 куб.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; - Капитальное строение инв. № 400/С-97349 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная фекальная канализация), протяженностью 43,20 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная фекальная канализационная сеть к зданию насосной станции; - Капитальное строение инв. № 400/С-97339 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная ливневая канализация), протяженностью 43,85 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная ливневая сеть к резервуару для воды; - Капитальное строение инв. № 400/С-97334 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод), протяженностью 24,45 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121 внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод к зданию автоматической насосной станции; - Капитальное строение инв. № 400/С-97386 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная сеть наружного освещения), протяженностью 267,15 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121 внутриплощадочная сеть наружного освещения здания автоматической насосной станции, резервуара для воды и здания ангара; - Капитальное строение инв. № 400/С-97378 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная электрическая сеть 0,4 кВ), протяженностью 119,25 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, электрическая сеть 0,4 кВ к зданию автоматической насосной станции; - тополь (2 единицы); - каштан (14 единиц).
Земельный участок, на котором расположен объект	кадастровый номер 440100000002008244, площадью 0,4859 га (назначение – для обслуживания здания автоматической насосной станции (инв. № 400/С-69050), резервуара для воды на 500 куб.м (инв. № 4660) и здания ангара (инв. № 400/С-89984)) по адресу: г.Гродно, ул. Максима Горького, 121 Ж
Начальная цена продажи	2 467 235 176 (два миллиарда четыреста шестьдесят семь миллионов двести тридцать пять тысяч сто семьдесят шесть) белорусских рублей без учета НДС
Сумма задатка	123 361 759 (сто двадцать три миллиона триста шестьдесят одна тысяча семьсот пятьдесят девять) белорусских рублей
Условия аукциона	Без условий
ЛОТ 3	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	- Капитальное строение инв. № 400/С-63419 (назначение – здание нежилое, наименование – здание установки контактного выпаривания), площадью 662,4 кв.м, г.Гродно, ул. Максима Горького, 121Д; - Капитальное строение инв. № 400/С-97341 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство территории), площадью 165,0 кв.м, г.Гродно, ул. Максима Горького, 121, благоустройство территории для обслуживания здания установки контактного выпаривания, резервуара; - Капитальное строение инв. № 400/С-58964 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – резервуар на 250 куб.м пожарно-аварийный водоем), объемом 250 куб.м, г.Гродно, ул. Максима Горького, 121; - Капитальное строение инв. № 400/С-97347 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная фекальная канализация), протяженностью 365,10 м, г.Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная фекальная канализационная сеть к зданию установки контактного выпаривания; - Капитальное строение инв. № 400/С-97335 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод), протяженностью 22,15 м, г.Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод к зданию установки контактного выпаривания; - Капитальное строение инв. № 400/С-97385 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная сеть наружного освещения), протяженностью 103,70 м, г.Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная сеть наружного освещения здания установки контактного выпаривания, резервуара; - Капитальное строение инв. № 400/С-97382 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная электрическая сеть 0,4 кВ), протяженностью 117,70 м, г.Гродно, ул. Максима Горького, 121, электрическая сеть 0,4 кВ к зданию установки кинтактного выпаривания; - шкаф распределительный ПР-24-7208; - липа (4 единицы); - тополь (2 единицы)
Земельный участок, на котором расположен объект	кадастровый номер 440100000002008243, площадью 0,2356 га (назначение – для обслуживания здания установки контактного выпаривания (инв. № 400/С-63419), резервуара на 250 куб.м ПАВ (инв. № 4702)) по адресу: г.Гродно, ул. Максима Горького, 121 Д
Начальная цена продажи	2 261 889 887 (два миллиарда двести шестьдесят один миллион восемьсот восемьдесят девять тысяч восемьсот восемьдесят семь) белорусских рублей без учета НДС
Сумма задатка	113 094 494 (сто тринадцать миллионов девяноста четыре тысячи четыреста девяносто четыре) белорусских рубля
Условия аукциона	Без условий
ЛОТ 4	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	- Капитальное строение инв. № 400/С-69029 (назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – блок предочистки), площадью 320,4 кв.м, г.Гродно, ул. Максима Горького, 121Е; - Капитальное строение инв. № 400/С-97343 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство территории), площадью 390,0 кв.м, г.Гродно, ул. Максима Горького, 121, благоустройство территории для обслуживания здания блока предочистки; - Капитальное строение инв. № 400/С-97350 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная фекальная канализация), протяженностью 12,50 м, г.Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная фекальная канализационная сеть к зданию блока предочистки; - Капитальное строение инв. № 400/С-97331 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод), протяженностью 190,40 м, г.Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочный хозяйственно-питьевой водопровод к зданию предочистки; - Капитальное строение инв. № 400/С-97381 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная электрическая сеть 0,4 кВ), протяженностью 80,80 м, г.Гродно, ул. Максима Горького, 121, электрическая сеть к зданию блока предочистки; - липа (12 единиц); - шкаф распределительный; - дерен белый (1 единица)
Земельный участок, на котором расположен объект	кадастровый номер 440100000002008245, площадью 0,2180 га (назначение – для обслуживания здания блока предочистки (инв. № 400/С-69029)) по адресу: г.Гродно, ул. Максима Горького, 121 Е
Начальная цена продажи	2 871 131 420 (два миллиарда восемьсот семьдесят один миллион сто тридцать одна тысяча четыреста двадцать) белорусских рублей без учета НДС
Сумма задатка	143 556 571 (сто сорок три миллиона пятьсот пятьдесят шесть тысяч пятьсот семьдесят один) белорусский рубль
Условия аукциона	Без условий
ЛОТ 5	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	- Капитальное строение инв. № 400/С-17193 (назначение – здание специализированное для производства текстильных, швейных и кожаных изделий, наименование – главный производственный корпус), площадью 29971,7 кв.м, г.Гродно, ул. Максима Горького, 121Г, состоящее из капитальное строение инв. № 400/D-152212 (назначение – производственное помещение, наименование – главный производственный корпус), площадью 29418,5 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г-2 и капитальное строение инв. № 400/D-123114 (назначение – помещение неустановленного назначения, наименование – помещение неустановленного назначения), площадью 523,0 кв.м, г.Гродно, ул. Максима Горького, 121Г-1; - Капитальное строение инв. № 400/С-69015 (назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – автоматическая насосная станция пожаротушения), площадью 160,5 кв.м, г.Гродно, ул. Максима Горького, 121Г/2; - Капитальное строение инв. № 400/С-69014 (назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – КПП-120), площадью 19,6 кв.м, г.Гродно, ул. Максима Горького, 121Г/1; - Капитальное строение инв. № 400/С-97344 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство территории), площадью 7950,0 кв.м, г.Гродно, ул. Максима Горького, 121, благоустройство территории для обслуживания зданий и сооружений главного производственного корпуса; - Капитальное строение инв. № 400/С-86338 (назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – резервуар для хранения 8% раствора пенообразователя), объемом 250,0 куб.м, г.Гродно, ул. Максима Горького, 121; - Капитальное строение инв. № 400/С-58965 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – резервуар на 1000 куб.м), объемом 1000 куб.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121; - Капитальное строение инв. № 400/С-89988 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – площадка под емкости), площадью застройки 119,0 кв.м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;
Наша ответственность заключается в выражении мнения о данной финансовой отчетности на основе проведенного нами аудита. Мы провели аудит в соответствии с Международными стандартами аудита. Данные стандарты требуют соблюдения этических норм, а также планирования и проведения аудита таким образом, чтобы получить разумную уверенность в том, что финансовая отчетность не содержит существенных искажений.

Аудит включает проведение процедур, направленных на получение аудиторских доказательств, подтверждающих числовые показатели в финансовой отчетности и раскрытие в ней информации. Выбор процедур зависит от профессионального суждения аудитора, включая оценку рисков существенного искажения финансовой отчетности вследствие недобросовестных действий или ошибок. В процессе оценки этих рисков аудитор рассматривает систему внутреннего контроля за составлением и достоверным представлением финансовой отчетности, чтобы разработать аудиторские процедуры, соответствующие обстоятельствам, но не с целью выражения мнения об эффективности внутреннего контроля. Аудит также включает оценку надлежащего характера примененной учетной политики и обоснованности бухгалтерских оценок, сделанных руководством, а также оценку представления (консолидированной) финансовой отчетности в целом.

Мы полагаем, что полученные нами аудиторские доказательства являются достаточными и надлежащими для выражения нашего аудиторского мнения.

Мнение

По нашему мнению, финансовая отчетность отражает достоверно во всех существенных отношениях финансовое положение ОАО «Паритетбанк» по состоянию на 31 декабря 2014 года, а также его финансовые результаты и движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с Международными стандартами финансовой отчетности.

Поясняющий параграф

Не изменяя свое мнение, мы обращаем внимание на факт, описанный в примечании 2, в 2013 и 2014 годах экономика Республики Беларусь являлась гиперинфляционной согласно Международному стандарту финансовой отчетности 29 «Финансовая отчетность в условиях гиперинфляции» (МСФО 29). Функциональной валютой Банка является белорусский рубль и, соответственно, финансовая отчетность за год, закончившийся 31 декабря 2014 года, включая сопоставимую информацию, была скорректирована в соответствии с МСФО 29.

Прочие сведения

Финансовая отчетность ОАО «Паритетбанк» за год, закончившийся 31 декабря 2013 года, была проведена другим аудитором, чей отчет датирован 18 апреля 2014 года и содержит безусловно положительное мнение в отношении указанной отчетности.

Ирина Верещагина
Партнер

ООО «КПМГ»
Минск, Беларусь
16 марта 2015 г.

БЫЦЬ ЦІ НЕ БЫЦЬ?

Самыя сур'ёзныя пагрозы для чалавецтва

Арганізацыя Global Challenges Foundation апублікавала свой першы даклад пра самыя сур'ёзныя пагрозы, з якімі можа сутыкнуцца чалавечая цывілізацыя ў будучыні. Ён уключае і існуючыя сёння пагрозы, і патэнцыйныя. Даследчыкі хочуць, каб людзі задумаліся і зрабілі што-небудзь для выпраўлення сітуацыі, бо пакуль яшчэ ёсць час, каб знайсці магчымыя спосабы вырашэння праблем. Многія пагрозы, згаданыя ў спісе, сталі вынікам тэхналагічных і жыццёвых абставін, а іншыя існуюць яшчэ з часоў стварэння нашай планеты і з'яўлення чалавецтва.

Чалавек губіць сам сябе

Ядзерная вайна. Па ўсім свеце знаходзяцца вайсковыя базы, на якіх установлены сістэмы ядзернай зброі, і гэта нягледзячы на тое, што краіны імкнуцца паменшыць яе колькасць на планеце. Напружанне адносін паміж ЗША і Расіяй ва Усходняй Еўропе за апошнія гады пагоршылася крызісам, што адбываецца на тэрыторыі Украіны, і гэта пераконвае ў тым, што ядзерная вайна больш рэальная, чым гэта было раней. Калі хтосьці адзін націсне на кнопку, то свет асуджаны.

Штучны інтэлект. Стварэнне складаных робатаў і камп'ютараў, несумненна, мае вялікае значэнне для прагрэсу чалавецтва, але таксама гэта можа прывесці да канфлікту штучнага інтэлекту і чалавека. Пакуль чалавек кіруе робатамі, але ўсё можа змяніцца. Ужо зараз ёсць ваенныя робаты, якія могуць рэгенераваць і харчавацца, выкарыстоўваючы ўсе матэрыялы, што ёсць вакол. Такія кібаргі могуць рэальна пагражаць жыццю цывілізацыі, бо маюць найвышэйшую ступень выжывальнасці. Шанцы вельмі вялікія — ад 0 да 10%. Ды што там робаты, простыя пыласосы і тыя ўжо нападаюць на гаспадароў.

Гібель сістэмы. Гаворка ідзе пра крах сусветнай эканамічнай і палітычнай сістэм у выніку прыняцця няправільных рашэнняў у гэтых галінах, знясіленні рэсурснай базы Зямлі і ваенных канфліктаў.

Глабальная пандэмія. У апошнія гады ўсё часцей сталі трывожыцца пра прычыну гібелі чалавецтва ў выніку глабальных эпідэмій. Сведчаннем чаму можна назваць вялікую колькасць памерлых ад птушынага грыпу, які пачаўся ў Азіі і распаўсюдзіўся па ўсім свеце даволі хутка. Са свежых варта ўзгадаць і пра SARS у 2003 годзе, а зараз над чалавецтвам вісіць пагроза ад афрыканскай Эболы, у Паўднёвай Карэі зусім нядаўна з'явіўся новы небяспечны вірус Mers. Як відаць, колькасць іх толькі расце. Іронія лёсу, але тэхнічны прагрэс, у прыватнасці сусветная транспартная сістэма, стаў прычынай хуткага распаўсюджвання хвароб па ўсім свеце і гібелі мільёнаў людзей. Калі людзі не змогуць справіцца з такімі інфекцыйнымі захворваннямі, то насельніцтва планеты рэзка скароціцца. Патэнцыйна гэта магчыма, таму даследчыкі даюць шанц у 0,0001%.

Сінтэтычная біялогія. З таго часу, як чалавек навучыўся вырабляць хваробатворныя мікраарганізмы, якія трапляюць у навакольнае асяроддзе, існуе рызыка, што гэта можа згуляць злы жарт з чалавецтвам і знішчыць яго і экасістэмы. Тэрарысты асабліва заклапочаныя пытаннем выкарыстання біялагічнай зброі. Генная інжынерыя прывядзе да мутацый і да няздольнасці нашага арганізма змагацца з патагеннымі мікраарганізмамі. Шанц развіцця падобных падзей — 0,01%.

Прырода доўга не вытрывае

Экалагічныя катастрофы. Навукоўцы ўжо даўно папярэджваюць аб тым, што знікаюць многія віды жывёл і раслін. Наш спосаб жыцця і спосаб жыцця жывёл залежаць ад складанай экасістэмы, і калі віды пачынаюць знікаць, гэта становіцца каталізатарам для незваротных працэсаў, якія негатыўна адаб'юцца на нас у будучыні і ў сучаснасці. Нават абмежаваныя тэрыторыяй экалагічныя катастрофы маюць агульнапланетарныя наступствы.

Кардынальныя кліматычныя змены. За апошнія дзесяцігоддзі клімат перажывае рэзкія змены, і даследчыкі лічаць іх адной з самых сур'ёзных пагроз для чалавецтва. Прычым абставіны для іх у значнай ступені стварае менавіта дзейнасць чалавека. Па ўсім свеце праводзяцца міжнародныя канферэнцыі па гэтых пытаннях, дзе ўрады шматлікіх краін абмяркоўваюць пагрозы і спосабы выхаду з такой сітуацыі, але ўсё, што яны заяўляюць, — не выконваюць. Калі адбудуцца кардынальныя змены клімату, гэта прывядзе да голаду, засух, масавых міграцый людзей, павышэння ўзроўню сусветнага акіяна, у выніку чаго шмат якія тэрыторыі стануць нежылымі. Наступствы змен клімату асабліва востра адаб'юцца на жыцці бедных дзяржаў. Шанц такога развіцця падзей вылічаецца 0,01%, і адбыцца гэта можа за наступныя 200 гадоў.

Падзенне астэроіда. Адной з версій гібелі дыназаўраў 65 мільёнаў гадоў таму з'яўляецца ўдар аб зямлю вялікага астэроіда. Даследчыкі сцвярджаюць, што астэроід дыяметрам да 5 км у сярэднім падае на Зямлю кожныя 20 мільёнаў гадоў. У выніку такой катастрофы загінуць цэлыя краіны, дэстабілізуюцца палітычная і эканамічная сістэмы, зменіцца клімат, і выжыць будзе немагчыма. Такому развіццю падзей даследчыкі даюць шанц 0,00013%.

Супервулкан. У гісторыі чалавецтва мелі месца маштабныя вывяржэнні вулканаў, якія сталі прычынай экалагічных і антрапагенных катастроф. Вывяржэнне Везувія прывяло да гібелі горада Пампеі і яго жыхароў. А 3000 гадоў таму ў выніку вывяржэння вулкана загінула Мінойская цывілізацыя. Так званы «супервулкан» зможа выкінуць у атмасферу столькі попелу, што на Зямлі зменіцца клімат, амаль як у выніку ядзернага выбуху. Шанц, што такое можа адбыцца, складае 0,0001%.

Невядомыя прычыны

Мы не можам ведаць усё, і даследчыкі мяркуюць, што могуць адбыцца іншыя падзеі, якія стануць прычынай гібелі чалавецтва. Магчыма, гэта будзе атака іншапланетнай цывілізацыі ці доследы навукоўцаў, якія прывядуць да гібелі цывілізацыі. Напрыклад, уплыў аэразоляў на навакольнае асяроддзе раней не быў вядомы людзям, а сёння ўсе ўсведамляюць яго. У будучыні могуць адбыцца падзеі, невядомыя сёння, якія знішчаць чалавецтва і нават планету. Шанц развіцця падобнай сітуацыі ацэньваецца даследчыкамі ў 0,1%.

ВЫРАТУЕМ СЯБЕ САМІ!

Фантастычныя спосабы выжывання чалавецтва

Прагнозы наконт гібелі чалавецтва, вядома, навяваюць сум і роспач, але, як амаль заўсёды ў жыцці, павінен існаваць і іншы варыянт — так званыя лекі, а ў нашым выпадку можна сказаць прама — выратаванне нашага з вамі і нашчадкаў існавання. Нядаўна фізік Стэф Хоўкін заявіў, што калі людзі не хочуць проста вымерці, то ім варта пакінуць Зямлю. Акрамя таго, ён агучыў вядомыя факты пра тое, што многія віды жывёл і раслін ужо выміраюць і людзі маюць усе шанцы знішчыць саміх сябе і планету. Як было расказана ў публікацыі вышэй, ядзерная зіма, атака астэроіда, пандэміі, штучны інтэлект складаюць спіс самых страшных і рэальных прычын гібелі чалавецтва. Зрэшты, не ўсё так змрочна! Таму што існуюць сцэнарыі выратавання, з якімі і прапануем з падачы навукоўцаў усёй планеты азнаёміцца.

На роднай Зямлі

Аздаравіць планету. Нягледзячы на магчымыя ядзерную зіму, атаку астэроіда і іншыя катастрофы, адзін са спосабаў выжыць — гэта аздаравіць планету. Для арганізацыі прытулку людзі будуць вымушаны сяліцца ў месцах, якія змогуць выстаяць пры любых катастрофах. Забеспячэнне чалавецтва ежай і вадой не будзе складанай задачай, бо ўжо існуюць тэхналогіі ачысткі, дыстыляцыі і зберажэння. Прадукты трэба будзе кансерваваць, так яны не толькі доўга могуць захоўвацца, але і не будуць падвяргацца ўздзеянню радыяцыі. На перспектыву людзі павінны будуць падумаць аб адраджэнні зніклых прадстаўнікоў флоры і фаўны. Сховішча насення Svalbard Global Seed Vault, якое знаходзіцца ў Нарвегіі, здольна размясціць на захоўванне ад 250 мільёнаў да 2 мільярдаў тон збожжа. Яно размешчана ў гары, дзе захоўваецца пастаянная тэмпература, на вышыні 120 метраў над узроўнем мора і ўдалечыні ад тэктанічных разломаў. Акрамя гэтага, у ім існуе лабараторыя, дзе знаходзіцца банк генаў, з дапамогай якіх можна будзе адрадзіць неабходную расліну ці нават жывёлу.

Вымушаная эвалюцыя. Калі харчовы ланцужок перапыніцца ў выніку чумы або пандэміі сярод людзей, то на дапамогу можа прыйсці генная інжынерыя. Навукоўцы ўжо высветлілі, як зрабіць так, каб маніпуляваць паводзінамі вірусаў і рэпрадукцыяй, а таксама як уплываць на набор генаў чалавека. Многія вірусы здольныя забіць нашу імунную сістэму або лекі, якія атакуюць сам вірус. Генная інжынерыя і генная тэрапія змогуць папярэдзіць з'яўленне ў будучыні многіх страшных хвароб, прыбіраючы з ланцужка ДНК дрэнныя гены і замяшчаючы іх добрымі. Такі прыём называецца геннай тэрапіяй саматычных генаў.

Жыццё пад зямлёй. У 30-х гадах ужо з'явілася ідэя будаўніцтва 35-павярховага падземнага завода з мэтай бяспекі будынкаў, асабліва ў актыўных сейсмічных рэгіёнах, напрыклад, у Японіі. Ідэя ніколі не была рэалізаваная, хоць бункеры і падземныя будынкі будуюць па ўсім свеце. Калі паверхня планеты стане варожай для чалавецтва ў выніку ядзернай зімы, сонечных штармоў і г.д., то сыход пад зямлю стане выдатным рашэннем, каб выжыць. Пад зямлёй можна займацца фермерствам, ужываць тэхналогіі перапрацоўкі. Адзіная праблема заключаецца ў тым, што пад зямлёй недастаткова сонечнага святла, прысутнічае толькі вентыляванае паветра і напружаная псіхалагічная сітуацыя, якая можа праявіцца душэўнымі хваробамі.

Каланізацыя акіяна. Адным з рашэнняў праблемы выжывання, а менавіта праблемы перанасялення і празмернага выкарыстання рэсурсаў, можа стаць засваенне акіяна. Гэтая тэхналогія называецца «Энергія тэмпературнага градыента марской вады». Яна заснавана на прынцыпе выкарыстання розніцы ў тэмпературных паказчыках марской вады ў залежнасці ад глыбіні, якая дазваляе атрымаць энергію. Акрамя гэтага, чалавек зможа выкарыстаць энергію хваль і сонца для фермерства, атрымання прэснай вады. Пад вадой можна будзе будаваць жыллё, прадпрыемствы, а на паверхні — плавучыя гарады. Прыкладам можа стаць Shimizu Mega-City — горад-піраміда, але пакуль яшчэ не вырашана праблема вялізнай вагі гэтага будынка.

Збегчы ў космас?

Арбітальныя станцыі. Калі не атрымаецца збалансаваць жыццё на планеце, ці яна будзе пакутаваць ад перанасялення, людзі змогуць паспрабаваць асвоіць касмічную прастору. Першым крокам стане будаўніцтва касмічных станцый, напрыклад, ідэя будаўніцтва Stanford Torus — вялікага кольца, рух якога вакол сваёй васі будзе сімуляваць гравітацыю. У сярэднім будзе дастаткова месца для стварэння прыроднага асяроддзя пражывання для чалавека, флоры і фаўны. Энергія будзе паступаць ад сонечных батарэй, а іншыя рэсурсы людзі будуць здабываць на астэроідах або на Месяцы і іншых планетах.

Аддаленыя паселішчы. Калі людзі будуць вымушаныя пакінуць Зямлю, то, як варыянт, яны змогуць каланізаваць іншыя планеты або астэроіды. Усе карысныя выкапні здабудуць на малых планетах і каметах. Адсутнасць гравітацыі аблегчыць шлях і спосаб дастаўкі выкапняў у месца прызначэння. Шмат лёду і злучэнняў на аснове вугляроду можна знайсці на касмічных аб'ектах у межах арбіт Сатурна, Урана, Нептуна. На спадарожніку Юпітэра, Ганімедзе, ёсць магнітнае поле, якое здольна змякчаць уздзеянне сонечнай радыяцыі на паверхню. Будаўніцтва такіх паселішчаў патрабуе будаўнічых матэрыялаў і паліва, а пасля вычарпання запасаў неабходна будзе мяняць месца дыслакацыі.

Паселішчы на іншых планетах. Калі людзі апынуцца ў космасе, то ім давядзецца сяліцца на іншых планетах удалечыні ад Зямлі. Гэтыя паселішчы будуць больш надзейнымі з-за доступу да карысных выкапняў і крыніц энергіі. Жыццё на такіх планетах, як Марс і Венера, магчымае толькі пад зямлёй з-за суровых умоў, экстрэмальных тэмператур, ціску.

Тэрафарміраванне планет. Гэта, бадай, самы амбіцыйны спосаб, каб выжыць. Тэрафарміраванне заключаецца ў тым, каб прывесці атмасферу і нетры планеты ў стан, падыходзячы для жыцця людзей, дзякуючы пэўным тэхналогіям. Для пачатку неабходна справіцца з парніковым эфектам, падняць тэмпературу на паверхні планеты. У выніку тэрафарміравання на Марсе выпараць полюсныя ледзяныя шапкі планеты, вылучыцца дыяксід вугляроду ў атмасферу, тэмпература і ціск на планеце ўзрастуць. Акрамя гэтага, трэба падумаць аб крыніцах вады, высадзіць дрэвы (на што спатрэбіцца некалькі дзясяткаў гадоў), каб яны пачалі выпрацоўку кісларода, і паветра стала прыдатным для дыхання.

І нікуды чалавецтву не дзецца.

novate.ru

Матэрыялы паласы падрыхтаваў Іван КУПАРВАС. *hvir@zviazda.by*

НА АДПАЧЫНАК — У «БЯРЛОГУ»

Яшчэ адным месцам адпачынку стане больш на Міншчыне. У вёсцы Перавоз Бярэзінскага раёна 1 жніўня адкрыецца аграсядзібны комплекс «Бярлога-хол».

Падчас урачыстасцяў прадэманструе сваё майстэрства адзін з самых дужых людзей планеты — Кірыл Шымко (асілак зрушыў з месца кран вагой 118 тон, устанавіўшы сусветны рэкорд). Будуць таксама арганізаваны выступленні народнага сямейна-абрадавага калектыву «Радзіна», кавер-бэнда «Грэнландыя», спартыўныя мерапрыемствы, міні-футбол, валейбол.

Гаспадар сядзібы пачастуе ўдзельнікаў і гасцей свята фірменнай рыбнай юшкай, прыгатаванай па сакрэтным рэцэпце.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ. *lazovskaya@zviazda.by*

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ

о проведении аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в дер. Напалки, дер. Калюжки и дер. Калюга Жодинского сельсовета Смолевичского района Минской области

1.	Форма проведения аукциона	Открытый
2.	Дата, время и место проведения аукциона	31 августа 2015 года, в 15.00 г. Жодино, пер. Молодежный, 3 Жодинский сельисполком, кабинет №1
3.	Продавец и его адрес	Жодинский сельский исполнительный комитет, г. Жодино, пер. Молодежный, 3
4.	Земельный участок, его кадастровый номер и адрес	**Лот № 1 –** земельный участок площадью 0,1500га с кадастровым номером 624881708801000093 в деревне Напалки, участок № 1 **Лот № 2 –** земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881708801000094 в деревне Напалки, участок № 2 **Лот № 3 –** земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881707601000222 в деревне Калюжки, участок № 37 по генплану **Лот № 4 –** площадью 0,1494 га с кадастровым номером 624881707501000103 в деревне Калюга **Лот № 5 –** площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881707501000104 в деревне Калюга **Лот № 6 –** площадью 0,1499 га с кадастровым номером 624881707501000105 в деревне Калюга
5.	Условия продажи	Без изменения целевого назначения
6.	Целевое назначение земельного участка	Для строительства и обслуживания жилого дома
7.	Начальная цена продажи	**Лот № 1 –** 30 000 000 рублей **Лот № 2 –** 30 000 000 рублей **Лот № 3 –** 60 000 000 рублей **Лот № 4 –** 35 000 000 рублей **Лот № 5 –** 35 000 000 рублей **Лот № 6 –** 35 000 000 рублей
8.	Условия проведения аукциона	Участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Аукцион считается состоявшимся при наличии не менее двух участников
9.	Наличие инженерной инфраструктуры	**Лот № 1, Лот № 2, Лот № 4, Лот № 5, Лот № 6 (возможность электроснабжения); лот № 3** (возможность электроснабжения и газоснабжения)
10.	Сумма задатка и реквизиты продавца	10% от начальной цены земельного участка, р/с 3604627020009 в филиале №616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, ул. 50 лет Октября, 25«А», код 812, УНП 600023532 (с пометкой «Задаток за земельный аукцион»), код платежа 04901
11.	Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками	каждый понедельник в 15.00
12.	Окончательный срок приема заявлений	26 августа 2015 года до 17.00
13.	Контактные телефоны	8-01775 35-449, 8-01775 37-174, 8-01775 37-189

Расходы по организации и проведению аукциона и затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Документ (копию), удостоверяющий личность (паспорт) покупателя, или его доверенного лица.
4. Доверенность, заверенную нотариально (в случае, если на аукционе интересы покупателя представляет это лицо).

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, НАХОДЯЩЕГОСЯ В СОБСТВЕННОСТИ

УЗ «ВОЛКОВЫССКАЯ ЦРБ» УНН 500007288

Лот № 3			
Предмет аукциона	комплекс зданий, сооружений, инженерных сетей поликлиники		
Местонахождение имущества	Гродненская обл., г. Волковыск, ул. Мицкевича, 37, 37/1		
Информация о земельном участке	площадь земельного участка 0,1038 га (под застройкой). Срок аренды – по 12 апреля 2065 г.		
Начальная цена предмета аукциона	506 490 948 рублей	**Размер задатка**	51 000 000 рублей
Продавец имущества	УЗ «Волковысская центральная районная больница», тел.: 8 (01512) 4 12 03, 4 12 98		
Аукцион состоится 20 августа 2015 года в 11.30 по адресу: г. Гродно, ул.17 Сентября, 39			
Сведение об организаторе торгов	Фонд «Гроднооблимущество», г. Гродно, ул. 17 сентября,39, тел. 8 (0152) 77 29 15		
Срок подачи документов	по 14 августа 2015 года до 12.00		
Условия использования недвижимого имущества	вовлечение в хозяйственный оборот в течение 3 лет с момента заключения договора купли-продажи		
Условия, связанные с использованием земельного участка, иные условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка	возможно использование для размещения жилой усадебной застройки, объектов общественного назначения, предназначенных для обслуживания населения; получение разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на реконструкцию (строительство) объекта в установленном порядке; осуществление реконструкции (строительства) объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.		

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ

в объявление о проведении аукциона по продаже имущества Гроднооблпотребобщества, назначенного на 03.08.2015 г. следующего содержания: аукцион состоится 03.09.2015 г. в 14.00, последний день приема заявлений 28.08.2015 г. до 15.00.

УНП 590959404

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	Капитальное строение, инв. № 420/С-3357 (назначение – здание нежилое), площадью 58,0 кв.м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Дворищанский с/с, южнее деревни Юровичи. Составные части и принадлежности: терраса
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 423683000044000001 (назначение – земельный участок для обслуживания охотничьего домика), площадью 0,0613 га, расположенном по адресу: Лидский р-н, Дворищанский с/с, южнее деревни Юровичи
Начальная цена продажи	55 800 000 (пятьдесят пять миллионов восемьсот тысяч) белорусских рублей без учета НДС
Сумма задатка	2 790 000 (два миллиона семьсот девяносто тысяч) белорусских рублей
Продавец	ОАО «Лидский завод электроизделий», 231300, г. Лида, ул. Фабричная, 4. Тел. 8-0154-52-13-47
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32, 41-98-34
Условия аукциона	Вовлечение в хозяйственный оборот в течение двух лет с момента заключения договора купли-продажи
Условия оплаты	Полный расчет по договору купли-продажи в течение 5 (пяти) банковских дней после заключения договора
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225.

Аукцион состоится 14 августа 2015 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209.

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов по названной аукционистом цене. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звезда» 01.04.2015 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209 с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг), с 8.30 до 16.30 (пятница)

Последний день приема заявлений – 11 августа 2015 г. до 15.00.

Телефоны для справок: 41-98-32, 41-98-34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».

УНП 500021270

Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2

- ► ОЦЕНКА ОБОРУДОВАНИЯ И ТРАНСПОРТНЫХ СРЕДСТВ
- ► ОЦЕНКА НЕДВИЖИМОСТИ И СЕТЕЙ ВСЕХ ФОРМ СОБСТВЕННОСТИ
- ► РАЗДЕЛ И ВЫЧЛЕНЕНИЕ НЕДВИЖИМОСТИ И ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, **принадлежащих УО «Гомельский государственный университет имени Франциска Скорины» 8(0232) 60 70 51**

№ лота	Наименование объекта	Начальная цена продажи лота, бел. руб. (с НДС)	Сумма задатка, бел. руб.
1	- часть капитального строения (здание столовой №3) в составе: помещения подвала площадью 566,67 кв.м., помещения 1-го этажа площадью 629,28 кв.м.; часть капитального строения (склад) площадью 109,4 кв.м. Размер арендной платы в месяц составит 1174,81 базовой арендной величины без учета коммунальных услуг. Договор аренды заключается сроком на 3 (три) года. Цель использования: организация питания, розничная торговля, производство продуктов питания. - часть капитального строения (здание столовой №3) в составе: помещения 2-го этажа площадью 625,1 кв.м. Договор безвозмездного пользования помещениями сроком на 3 (три) года для организации питания студентов и организации питания студентов, проходящих оздоровление (лечение) в студенческом санатории-профилактории университета.	10 573 290	1 057 320
Адрес объекта	Гомельская обл., г. Гомель, ул. Песина, 74		
Срок подачи заявления	По 31 августа 2015 г. в рабочие дни с 9.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2		
Дата, время, место проведения аукциона	**02 сентября 2015 г. в 11-00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2		
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 3012105618108 в РД №700 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, УНП 102353509 Получатель платежа: Филиал РУП «Жилкоммунтехника» «Центр «Белтехинвентаризация»		
Условия продажи	Цены указаны с НДС. Шаг аукционных торгов – 5%, заключить договор аренды в течение 10-ти календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона, оплатить стоимость права аренды согласно договора аренды. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона		

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет Организатора аукциона (Филиал РУП «Жилкоммунтехника» «Центр «Белтехинвентаризация») р/с 3012105618108 в РД №700 ОАО«БПС-Сбербанк», код 369, УНП 102353509 по 31 августа 2015 года в рабочие дни с 09-00 до 13-00 и 14-00 до 17-00.

2. Подать заявление Организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2, по 31 августа 2015 года в рабочие дни с 09-00 до 13-00 и 14-00 до 17-00 от даты опубликования настоящего извещения.

К заявлению прилагаются следующие документы:

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);

- индивидуальным предпринимателем – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, без нотариального засвидетельствования; гражданину Республики Беларусь – копия паспорта и копия договора на открытие текущего (расчетного) счета (в случае отсутствия у физического лица текущего счета – необходимо его открыть); представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность, заверенная нотариально.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается Организатором аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор аренды в срок не позднее 10 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить право аренды в сроки, определенные в договоре аренды, и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы по изготовлению и предоставлению участникам аукциона документации, необходимой для его проведения в течение 3 (трех) рабочих дней. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала аукциона. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору аренды.

Дополнительная информация по тел. (0232) 75 06 62, 75 06 63 (факс), сайт www.bti.by.

ПЕРАКЛАДЗІЦЕ З РУСКАЙ МОВЫ НА БЕЛАРУСКУЮ НАСТУПНЫЯ СЛОВЫ:

Па гарызанталі: 1. Слог. **4.** Полнолуние. **7.** Пойма. **10.** Лента (в косах). **11.** Расчёт. **12.** Собственник. **13.** Совет. **16.** Стихийное бедствие, беда. **19.** Насилие. **21.** Семена. **22.** Приспособление (механизм). **24.** Плакса, нюня. **25.** Баран (производитель). **28.** Овца. **31.** Залоговый. **32.** Мелкий, мелководный. **33.** Скверно, отвратительно. **34.** Вокруг, кругом. **35.** Прядь. **36.** Сундук.

Па вертыкалі: 2. Поленница. **3.** Забота, печаль. **4.** Забор (из бревен). **5.** Нельзя, невозможно. **6.** Подвал, подполье. **8.** Лакомство. **9.** Кожа. **14.** Ставня, ставень. **15.** Жёрдочка, перекладина. **17.** Издание. **18.** Ледоруб. **19.** Честь, почёт. **20.** Сума (символ нищеты). **23.** Кустарник, заросли. **25.** Обезьяна. **26.** Риск. **27.** Година, время. **28.** Осыпь (геол.) **29.** Живот, утроба. **30.** Ответ.

Склала Таццяна КУЗЬМІЧ,
г. Віцебск.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ.
Па гарызанталі: 1. Склад. 4. Поўня. 7. Абалона. 10. Каснік. 11. Разлік. 12. Уласнік. 13. Парада. 16. Навала. 19. Гвалт. 21. Насенне. 22. Прылада. 24. Румза. 25. Маркач. 28. Авечка. 31. Станавы. 32. Плыткі. 33. Пагана. 34. Наўкола. 35. Пасма. 36. Куфар. **Па вертыкалі:** 2. Касцёр. 3. Дакука. 4. Паркан. 5. Нельга. 6. Склеп. 8. Ласунак. 9. Скура. 14. Аканіца. 15. Ашэстак. 17. Выданне. 18. Ледасек. 19. Гонар. 20. Торба. 23. Хмызняк. 25. Малпа. 26. Рызыка. 27. Часіна. 28. Асыпак. 29. Чэрава. 30. Адказ.

КРЫЖАВАНКА-ПЕРАКЛАД



СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.21	21.10	15.49
Віцебск —	5.05	21.05	16.00
Магілёў —	5.11	21.00	15.49
Гомель —	5.14	20.50	15.36
Гродна —	5.37	21.24	15.47
Брэст —	5.45	21.18	15.33

Месяц

Поўня ў 13.44.
Месяц у сузор'і Вадалея.

Імяніны

Пр. Емяльяна, Івана.
К. Алены, Ігната, Рамана.



Фота Алесі ВАРАБ'ЁВАЙ.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

31 ЛІПЕНЯ

1605 год — у Крамлі венчаны на царства «Дзімітрый Іванавіч», больш вядомы як Ілжэдзмітрый I. Па адной з версій гэтым чалавекам быў манах Маскоўскага Чудава манастыра Рыгор Атрэп'еў. Абвясціўшы сябе царэвічам Дзімітрыем (сынам цара Івана IV Грознага, які на самой справе загінуў пры загадкавых абставінах ва Углічы), ён уцёк з Масквы ў Рэч Паспалітую, дзе знайшоў прытулак у замку сандамірскага ваяводы Юрыя Мнішка. Заручыўшыся падтрымкай караля Жыгімонта III Вазы і мясцовай арыстакратыі, ён сабраў значнае войска і арганізаваў паход на Масковію. Пацярпеўшы спачатку паражэнне ад войска цара Барыса Гадунова, ён здолеў узяць рэванш і пасля раптоўнай смерці Гадунова захапіць уладу ў краіне. 31 ліпеня 1605-га каля алтара Лжэдзмітрый выступіў з прамовай аб сваім цудоўным выратаванні ад гадуноўскіх забойцаў, пасля чаго патрыярх Ігнацій (стаўленік самазванца, якім замянілі ранейшага патрыярха Іова) надзеў на яго галаву вянок маскоўскіх цароў, а баяры паднеслі скіпетр і дзяржаву.

1802 год — нарадзіўся (вёска Мядвядка, цяпер Карэліцкі раён) Ігнат Іпалітавіч Дамейка, беларускі вучоны, геолаг, мінеролаг, член многіх навуковых таварыстваў. Нацыянальны герой Чылі. У 1822 годзе скончыў Віленскі ўніверсітэт. А ў 1838-м ён даведаўся, што Чылійскай рэспубліцы патрэбны выкладчыкі хіміі і мінералогіі. Аформіўшы кантракт на 6 гадоў, вучоны і не падазраваў, што яго знаходжанне ў гэтай краіне працягнецца 46 гадоў і што Чылі стане для яго другой радзімай. У гэтай краіне ён адкрыў салетру, знайшоў поклады золата, серабра, медзі і каменнага вугалю. Знайшоўшы ў гарах вытокі чыстай вады, ён пабудаваў вадаправод і забяспечыў вадой Сант'яга. Стварыў у Чылі мінералагічны музей і бібліятэку прыродазнаўства. Ажыццявіў вельмі складаныя экспедыцыі ў Анды, зрабіў мноства адкрыццяў, часам рызыкуючы жыццём. Як вынік, у навуковых атласах з'явіўся невядомы раней мінерал дамейкіт. Ён карэнным чынам змяніў сістэму адукацыі ў Чылі, напісаў падручнікі па мінералогіі і фізіцы, увёў у краіне метрычную сістэму. У 1867-1883 гадах з'яўляўся рэктарам універсітэта ў Сант'яга. У 1884-м І. Дамейка наведаў радзіму. Памёр у 1889 годзе. У яго гонар чылійскі ўрад выпусціў памятны залаты медаль, а таксама яго імем быў названы горад і марскі порт. Пасля смерці Ігнат Дамейка быў абвешчаны нацыянальным героем, а ў сталіцы Чылі ўстаноўлены помнік з надпісам «Вялікаму асветніку».

1903 год — у Бруселі пачаў работу (працягнуў яе затым у Лондане) II з'езд РСДРП, на якім расійская сацыял-дэмакратыя падзялілася на бальшавікоў і меншавікоў.

Было сказана

Фёдар ЯНКОЎСКІ, пісьменнік, мовазнавец, публіцыст:
«Глядзі людзей, ідзі з людзьмі — чалавекам будзеш».

Азбука народнай культуры

ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч

ТРАВА сімвалізавала падпарадкаванасць у адносінах паміж людзьмі. Акрамя таго, траву ў народнай культуры лічылі сімвалам ціхага шэпту і малітвы: «чуваць, як трава шапоча». У перыяд з 7 чэрвеня па 7 ліпеня цаліцелі збіралі лекавыя расліны (травы). Лічылася, што найбольшай лекавай сілай травы і карэнне валодаюць менавіта ў дні летняга сонцастаяння: «калі сонейка аддае ўсю моц матухне-зямельцы, а потым сыходзіць на пакой».

◈ У славянскім фальклоры шмат паданняў аб з'яўленні лекавых траў. Вось адно з іх: «Бог намаляваў на зямлі выяву чалавека і паставіў да яго сабаку і вартаўніка. Да сабакі прыйшоў чорт і стаў спакушаць яго, кажа: «Ты пакінь сваю варту, ты зараз нічым не накрыты, а табе за гэта дам цёплае футра». Сабака адышоў ад намаляванай выявы, а чорт схапіў і нанёс «чалавеку» 70 ран. Бог убачыў гэта і стварыў супраць кожнай раны 70 лекавых раслін».

◈ Людзей, якія валодалі майстэрствам лячыць з дапамогай траў, звалі траўнікамі, зелейнікамі, травазнямі, знахарамі.

◈ Калі вы звяртаецеся па дапамогу да народных лекараў, трэба ведаць, што траўнік ніколі не аддасць вам лекавы сродак (настой ці парашок) у «сваім» посудзе.

◈ Лічыцца, што за лекі, атрыманыя ад цаліцеля, нельга казаць «дзякуй», інакш яго ўжыванне не дасць станоўчых вынікаў.

◈ Лічылася, што травы валодаюць не толькі добрай (станоўчай), але і адмоўнай энергетыкай. З дапамогай адных траў можна паставіць на ногі паміраючага чалавека, а іншымі травамі – забіць, сурочыць чалавека і хатнюю жывёлу, пасварыць людзей і г.д.

◈ Народныя знахары былі ўпэўнены, што ў кожнага чалавека ёсць свая расліна-лекар. Для гэтага неабходна з усёй безлічы раслін абраць тую, якая вам бліжэй да сэрца, паважаць і даглядаць яе, і расліна ў цяжкі для вас час адкажа вам тым жа – дабрынёй і дапамогай (у гэтым выпадку «спрацуе» сіла раслін і прынцып падабенства). Такую расліну можна знайсці не абавязкова ў садзе ці на агародзе, але нават і ў вашай гарадской кватэры.

УСМІХНЕМСЯ

У майго сябра сёння дзень нараджэння. Ён не п'е, не курыць, не ўжывае наркотыкаў, не азартны і не здраджвае сваёй дзяўчыне.

Халера яго ведае, як будзем адзначаць...

— Фіма, колькі вы важыце?

— У акулярах — сто дваццаць кілаграмаў.

— А без акуляраў?

— А без акуляраў я не бачу вагу.

Вось банкамат — сапраўдны мужчына! Ніколі не пытаецца, чаму я так шмат зняла і на якое глупства патраціла!

— Утаймуйце свайго сабаку! Учора ён так скуголіў, што мая дачка была вымушана спыніць урок спеваў!

— Прабачце, але ваша дачка пачала першай!

Паспрачаліся неяк на даху каты, хто з іх трапляў у самыя жудасныя жыццёвыя сітуацыі. Трэцяе месца заняў кот, які праваліўся ў каналізацыю, поўную пацукоў. Другое — кот, які зваліўся ў вальер з байцовымі сабакамі і здолеў адбіцца. Але перамагла з вялікім адрывам гісторыя кацяняці, якога аддалі ў дзіцячы садок і там з ім гулялі МАЛЕНЬКІЯ ДЗЕЦІ.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.840. Індэкс 63850. Зак. № 2938.
Нумар падпісаны ў 19.30 30 ліпеня 2015 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12